**Аляксандр Радзюк**
(Гродна)

# Паўстанне 1830-1831 гг. на Гродзеншчыне: ход, задушэнне, наступствы

Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі дало моцны штуршок развіццю ў гэтым рэгіёне нацыянальна-вызваленчага руху. Жорсткае задушэнне паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, крушэнне надзей 1812 г. не здолелі стрымаць жыхароў гэтага краю ад актыўнага ўдзелу ў барацьбе за адраджэнне колішняй Рэчы Паспалітай. Пры гэтым неабходна адзначыць, што Рэч Паспалітая палітычай элітай беларуска-літоўскага краю ўспрымалася не як унітарная, выключна польская, а як федэратыўная дзяржава дзвюх народаў. Рэчпаспалітаўскі патрыятызм трымаўся на перакананні, што без дапамогі Польшчы Літва не здолее вызваліцца з-пад расійскага панавання. Менавіта ў гэтым рэчышчы на Беларусі дзейнічалі шматлікія тайныя і легальныя арганізацыі. На працягу 1815-1830 гг. на тэрыторыі Каралеўства Польскага і заходніх губерняў Расійскай імперыі існавала больш за 70 тайных згуртаванняў[1]. Таварыствы ў найбольшай ступені былі распаўсюджаны сярод вучнёўскай моладзі, але існавалі яны таксама і ў асяроддзі вайскоўцаў. „Змоўніцкая" плынь была характэрнай рысай нацыянальна-вызваленчага руху таго часу многіх краін. Тут варта прыгадаць выступленне дзекабрыстаў у Расіі ці прыклады іншых заходнееўрапейскіх дзяржаў, дзе атрымаў распаўсюджанне рух карбанарыяў. Дарэчы, выступленне ў Варшаве ў лістападзе 1830 г. было таксама падрыхтавана невялікай групай змоўшчыкаў, што паўстала ў варшаўскай школе падхарунжых у 1828 г. Гэтая акцыя так бы і засталася лакальнай з'явай, калі б яе не падтрымалі многія тысячы жыхароў былой Рэчы Паспалітай. А для паўстання на гэтых абшарах існаваў цэлы шэраг перадумоў як нацыяльнага, так і сацыяльна-палітычнага характару.

Значнаму росту незадаволенасці розных слаёў насельніцтва на тэрыторыі Беларусі садзейнічала палітыка, якую праводзіў царызм на „новадалучаных" землях. У першую чаргу гэтая палітыка закранала інтарэсы мясцовай (пераважна дробнай) шляхты. Усе расійскія імператары, пачынаючы з Кацярыны II, імкнуліся да рэдукцыі гэтага саслоўя, у якім яны (і не без падстаў) бачылі галоўную пагрозу палітычнай стабільнасці на гэтых землях. Асабліва актывізавалася гэтая палі-

[1] H. Dylągowa, *Powstanie w planach polskich związków tajnych 1815-1830*, [w:] *Powstanie listopadowe 1830-1831*, Warszawa 1983, s. 17.

тыка пры Мікалаі І. У 1826 г. з'явіўся ўказ, які ўстанаўліваў тэрміны і парадак залічэння былой шляхты ў аклад, у 1928 г. — указ аб парадку абкладання ваколічнай і чыншавай шляхты падымным земскім падаткам. У 1929 г. былі створаны камісіі, якія заняліся распрацоўкай мер па зліццю дробнй шляхты з класам дзяржаўных сялян. Вядома ж, усе гэтыя мерапрыемствы выклікалі масавую незадаволенасць у асяроддзі гэтай сацыяльнай групы, якая не хацела мірыцца са стратай свайго прывілеяванага становішча. Палітыка царызму таксама закранала інтарэсы маёмаснай шляхты. Нягледзячы на тое, што на ўсё шляхецкае саслоўе было распаўсюджана дзеянне „Дарчай граматы расійскаму дваранству", якая забараняла адабранне спадчыннай маёмасці ў казну без пастановы суда, іх зямельная ўласнасць знаходзілася пад пагрозай секвестру і канфіскацыі. Правядзенне падзелаў Рэчы Паспалітай, паўстанне 1794 г., падзеі напярэдадні і падчас вайны 1812 г. сведчаць аб тым, што правы мясцовага набілітэту знаходзіліся ў прамой залежнасці ад ступені палітычнай лаяльнасці да існуючага рэжыму. І нават такія „правіннасці" як нявыплата экдывідарскіх пошлін, непастаўка ў тэрмін харчовых запасаў ці фуражу на патрэбы арміі і г.д. прыводзілі да накладання забароны на маёнтак.

Незадаволенне сярод розных сацыяльных груп выклікала з'яўленне на тэрыторыі Беларусі буйнога расійскага землеўладання. З аднаго боку гэты працэс непасрэдна закранаў інтарэсы сялянства. У выніку шматлікіх раздач у канцы XVIII ст. сотні тысяч беларускіх „душ" былі пераведзены з ліку дзяржаўных і царкоўных у разрад прыватнаўласніцкіх. Пасля далучэння да Расійскай імперыі значна пагоршылася сацыяльнае становішча ўсіх саслоўных груп сялянства. Замена падымнага падушным падаткам, увядзенне рэкруцкай павіннасці, павелічэнне феадальнай эксплуатацыі вялі да росту сацыяльнай напружанасці ў беларускай вёсцы. З іншага боку, пранікненне рускага элемента было негатыўна ўспрынята мясцовай элітай краю. Заняцце вышэйшых пасад у краі выхадцамі з цэнтральных губерняў Расіі, увядзенне палітычнага нагляду, інстытута жандармерыі, змены ў сістэме мясцовага кіравання і самакіравання, іншая судовая сістэма і прававая культура, адрозненні ў сферы каштоўнасцяў, менталітэту — усё гэта паступова вяло да прамога палітычнага канфлікту. Да гэтага неабходна яшчэ дадаць рэлігійны фактар, які адыгрываў вельмі істотную ролю ў жыцці тагачаснага грамадства. Усе гэтыя чыннікі абумовілі падтрымку паўстання з боку розных сацыяльных груп на тэрыторыі Беларусі ў цэлым і Гродзеншчыны ў тым ліку. Росту патрыятызму садзейнічала і эпоха рамантызму з яе ідэалізацыяй гераічнага мінулага, вобразаў паўстання 1794 г. і напалеонаўскай эпохі. Маладое пакаленне, выхаванае на гэтых прыкладах, імкнулася да ўласнай самарэалізацыі ў справе служэння Айчыне.

У канцы 20-х гадоў XIX ст., як адзначае беларускі гісторык Вольга Гарбачова, нацыянальна-вызваленчы рух, узброены ідэяй незалежнасці Рэчы Паспалітай, уступіў у новую стадыю свайго развіцця[2]. У гэты час рэзка абвастраюцца супярэчнасці паміж Расіяй і Каралеўствам Польскім, дзяржавамі, якія пасля 1815 г. былі звязаны паміж сабою асабістай уніяй. Незадаволенасць палякаў выклікалі ігнараванне з боку царскай фаміліі палажэнняў канстытуцыі, сістэматычнае парушэнне абвешчаных правоў і свабод, фактычна неабмежаваная ўлада намесніка ў асобе вялікага князя Канстанціна, які на практыцы адсунуў на другі план усе іншыя органы дзяржаўнага кіравання. Вялікім расчараваннем стала невыкананне абяцанняў Аляксандра I, якія ён урачыста даў на пасяджэнні першага сейма 1818 г. аб далучэнні ў будычым да Каралеўства літоўска-рускіх зямель[3]. Менавіта вырашэнне гэтага пытання стала адной з галоўных мэт лістападаўскага паўстання. Акрамя таго на падзеі ў Каралеўстве значны ўплыў аказаў і знешнепалітычны фактар. У ліпені 1830 г. адбылася рэвалюцыя ў Францыі, у жніўні паўстаў Брусель і бельгійскі народ скінуў з сябе галандскае ярмо. Усе гэтыя падзеі карэнным чынам закранали той еўрапейскі ўклад, які быў замацаваны Венскім кангрэсам. Галоўным жандарам Еўропы рыхтавалася стаць Расія. 5 лістапада 1830 г. быў выдадзены загад аб прывядзенні ў ваенную гатоўнасць 1 і 2 карпусоў пяхоты, 3 і 5 конных рэзервовых, асобнага Літоўскага корпуса і арміі Каралеўства Польскага[4]. Падрыхтоўка арміі да задушэння рэвалюцыі ў Францыі паскорыла ўзброенае выступленне ў Варшаве.

29 лістапада 1830 г. невялікая група цывільных асоб здзейсніла напад на Бельвядэрскі палац — рэзідэнцыю вялікага князя Канстанціна. Адначасова з гэтымі дзеяннямі асноўная частка змоўшчыкаў школы падхарунжых на чале з Пятром Высоцкім атакавала казармы рускіх войскаў і паспрабавала авалодаць арсеналам зброі, які размяшчаўся ў цэнтры польскай сталіцы. Актыўны ўдзел у гэтых падзеях прымалі і выхадцы з Гродзеншчыны, вучні варшаўскай школы падхарунжых Антоній Запаснік, Тадэвуш Гараін і Антоній Чарнецкі[5]. Выступленне змоўшчыкаў падтрымалі жыхары Варшавы, а пасля і іншыя рэгіёны Польшчы і, такім чынам, яно перарасло ў агульнанацыянальнае паўстанне.

Ва ўмовах бурлівай унутрыпалітычнай барацьбы сейм 20 снежня 1830 г. прыняў маніфест, які абвяшчаў паўстанне нацыянальным, а 25

[2] В. В. Гарбачова, *Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі*, Мінск 2001, с. 43.

[3] *Wybór źródeł do powstania listopadowego*, Wrocław 1957, s. XIII.

[4] Там жа, с. 10.

[5] В. В. Гарбачова, *Удзельнікі паўстання 1830-1831 гг. на Беларусі: біябібліяграфічны слоўнік*, Мінск 2006, с. 149, 353.

студзеня 1831 г. акт аб звяржэнні Мікалая I з польскага прастола. Фактычна гэты акт аб'яўляў вайну Расійскай імперыі. Пытанне аб землях былога ВКЛ было адным з найбольш злабадзённых у дзейнасці рэвалюцыйных улад. Нягледзячы на супраціў з боку кансерватыўных сіл, дэмакратычны блок імкнуўся ўсімі сродкамі падтрымаць „занёманскіх братоў". 1 лютага 1831 г. сейм ухваліў заклік, у якім ён вызваляў насельніцтва літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх зямель ад абавязкаў і прысягі Мікалаю I і заклікаў брацца за зброю, „каб сумеснымі намаганнямі аднавіць старажытную еднасць і ўнію, а таксама былыя правы і законы"[6]. Наступным крокам было ўтварэнне ў складзе польскай арміі двух спецыяльных легіёнаў: першага з жыхароў Літвы, Жмудзі, Беларусі, другога — з выхадцаў з Валыні, Падолля і Украіны. Па ініцыятыве дэмакратычных колаў наладжваліся канспіратыўныя зносіны з патрыятычнымі сіламі на тэрыторыі былога ВКЛ. Але складаныя абставіны на фронце і пэўная палітычная абмежаванасць праграмы паўстанцкага кіраўніцтва сталі перашкодай на шляху да аказання рэальнай дапамогі гэтым землям. Таму паўстанцкі рух разгортваўся тут па асобным сцэнарыі, на аснове ўласных рэсурсаў.

Вестка аб пачатку паўстання ў Варшаве падштурхнула развіццё нацыянальна-вызваленчай барацьбы на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Найбольш актыўная частка патрыётаў нелегальна перасякала мяжу Каралеўства і далучалася да польскіх паўстанцаў. Асабліва шмат такіх асоб было з Гродзенскай губерні[7]. Царскія ўлады ўсімі спосабамі спрабавалі замінаць гэтаму працэсу. У вышэйвыдадзеным указе на імя віленскага генерал-губернатара ад 7 снежня 1830 г.[8] Мікалай I заклікаў жыхароў заходніх губерняў да спакою і захавання вернасці трону. У канцы азначанага дакумента імператар, аднак, папярэдзіў, што, калі хтонебудзь забудзецца на свой абавязак прысягі і сумлення, то той будзе падлягаць „усёй суровасці права (...) і маёнтак яго будзе канфіскаваны"[9]. І ўжо літаральна праз пяць дзён (21 снежня) пасля выхаду гэтага ўказа, „прымаючы да ведама, што на падставе папярэдніх прыкладаў (...) маёнткі такіх парушальнікаў вернападданніцкага абавязку, якія ўступаюць у лік яўных ворагаў Дзяржавы, павінны падлягаць канфіска-

[6] И. Воронков, *Позиция польских повстанческих властей по вопросу их отношения к царскому правительству, русскому, украинскому, белорусскому, литовскому народам в период восстания 1830-1831 гг.*, [в:] *Славяне в эпоху феодализма*, Москва 1978, с. 228.

[7] A. Z. (K. Chłapowski), *Wojna na Litwie w roku 1831*, Kraków 1913, s. 23; А. К. Пузыревский, *Польско-русская война 1831 г.*, Санкт-Петербург 1890, с. 273.

[8] Далей усе даты пададзены па старому стылю.

[9] S. Rosiak, *Wileńska komisja śledcza (1831-1834)*, [w:] *Księga pamiątkowa koła historyków słuchaczy Uniwersytetu S. Batorego*, Wilno 1933, s. 251.

цыі”[10], урад выпускае яшчэ адзін указ аб накладанні забароны на маёмасць тых асоб, аб якіх было вядома, што яны знаходзіліся ў Каралеўстве Польскім.

Каб не дапусціць распаўсюджання бунтарскага духу на ўсход ад Каралеўства, 1 снежня Гродзенская губерня разам з Віленскай, Мінскай, Падольскай, Валынскай губернямі і Беластоцкай вобласцю была абвешчана на ваенным становішчы. А гэта азначае, што цывільнае насельніцтва гэтых тэрыторый аўтаматычна трапляла пад юрысдыкцыю ваенна-палявых законаў. Так, напрыклад, 28 снежня ў Новым Двары, што на тэрыторыі Гродзеншчыны, быў затрыманы шляхціц Л. Бергер за „распаўсюджанне розных абуральных звестак”[11]. Ужо на наступны дзень ён быў дастаўлены ваеннаму начальству і далей перададзены пад ваенны суд. Іншым прафілактычным мерапрыемствам урада стаў збор усіх тыпаў (уключаючы і антыкварную з палаца ў Дзярэчыне) зброі ў насельніцтва губерні.

Асаблівая ўвага царскімі ўладамі надавалася вучнёўскай моладзі, як адной з самых, на іх думку, небяспечных сацыяльных груп. 24 лістапада 1830 г. гродзенскі губернатар атрымаў ліст ад вялікага князя Канстанціна, у якім забаранялася жыхарам заходніх губерняў Расіі вучыцца ў Царстве Польскім. Забарона абгрунтоўвалася тым, што ў Гродзенскай губерні дастаткова вучылічшаў, гімназій і пансіёнаў, а вышэйшую адукацыю можна набыць ў Крамянецкім ліцэі або Віленскім універсітэце[12]. Прэвентыўныя меры ў сувязі з бояззю царызму пашырэння паўстання закранулі навучэнцаў амаль што ўсіх навучальных устаноў Гродзеншчыны. У канцы снежня 1830 г. галоўнакамандуючы рускай арміяй генерал-фельдмаршал Іван Дзібіч-Забалканскі забараніў адпускаць вучняў Віленскай навучальнай акругі на святы дадому. Тлумачылася гэта тым, што такія вакацыі „могуць схіліць моладзь да шматлікіх шкодных намераў”[13]. За тымі ж студэнтамі, якія былі адпушчаны раней, быў наладжаны паліцэйскі нагляд і ўзяты падпіскі аб нявыездзе. Забягаючы наперад, адзначым, што апасенні ўлад наконт вучнёўскай моладзі спраўдзіліся. Так, напрыклад, студэнты Віленскага ўніверсітэта сфармавалі асобны паўстанцкі атрад, які дзейнічаў у наваколлі Вільні. Сярод тых студэнтаў, што са зброяй у руках змагаліся супраць царызму, было шмат выхадцаў з тэрыторыі сучаснай Гродзеншчыны — усяго ўдалося выявіць 44 прозвішчы[14].

[10] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей: РДГА), ф. 384, воп. 1, спр. 1, арк. 2.

[11] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (далей: НГАБ у Гродне), ф. 1, воп. 3, спр. 846, арк. 8.

[12] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 991, арк. 2.

[13] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1086, арк. 1, 2, 9.

[14] В. В. Гарбачова, *Удзельнікі паўстання 1830-1831 гг. на Беларусі: біябібліяграфічны слоўнік*, Мінск 2006.

Сярод іншых прэвентыўных мерапрыемстваў улад адзначым узмацненне паліцэйскага нагляду і вайсковай прысутнасці. Так, тэрыторыя Гродзенскай губерні стала месцам дыслакацыі рускай арміі, якая рыхтавалася да задушэння паўстання ў Каралеўстве Польскім. 28 снежня галоўнакамандуючы дзеючай арміяй граф І. Дзібіч-Забалканскі прыбыў у Гродна, дзе рабіліся апошнія прыгатаванні перад пераходам мяжы. У першы дзень новага, 1831 г. па ўсіх частках арміі быў аддадзены загад правесці набажэнства ў сувязі з набліжэннем ваенных дзеянняў. Загад заканчваўся словамі: „няхай пашле Бог сваё бласлаўленне на ўтаймаванне польскіх бунтароў, якія зверглі парадак і законную ўладу”[15]. Таксама ўзмацніўся і пагранічны кантроль.

Аднак, нягледзячы на ўсе прынятыя захады, уладам так і не ўдалося стрымаць пранікнення „крамолы” ў заходнія губерні імперыі. У Вільні кожную ноч знаходзілі заклікі падтрымаць справу, якая пачалася ў Варшаве. На тэрыторыю Гродзенскай губерні такія адозвы дастаўлялі мужыкі, якія перавозілі харчовыя запасы з Каралеўства. Падобныя запіскі прышпільваліся ім за Нёманам і Бугам на грудзі нібыта ў якасці „ахоўных білетаў”[16]. А ў красавіку 1831 г. патрыятычныя заклікі сталі рэгулярна з’яўляцца ў розных частках Гродна. Пракламацыі варшаўскіх улад распаўсюджваліся сярод мясцовых жыхароў і з рук у рукі. Так, напрыклад, за іх неаднаразовае чытанне ў Гродне былі арыштаваны кухар Ю. Кіжалевіч і лёкай І. Паўлоўскі. Непасрэднай падрыхтоўкай паўстання на землях былога ВКЛ займаўся Цэнтральны паўстанцкі камітэт, які быў утвораны ў Вільні напрыканцы 1830 г. Дзеля каардынацыі дзейнасці ў розных рэгіёнах ім былі накіраваны эмісары ў Гродна, Ашмяны, на Міншчыну і Віцебшчыну[17]. Але ў цэлым Цэнтральны Віленскі паўстанцкі камітэт заняў даволі пасіўную пазіцыю і таму не адыграў значнай ролі ў разгортванні ўзброенай барацьбы на землях былога ВКЛ. У такой сітуацыі асноўны цяжар у падрыхтоўцы выступленняў лёг на асобныя рэгіёны.

На пачатку лютага 1831 г. асноўныя сілы рускай арміі распачалі ваенныя дзеянні на тэрыторыі Каралеўства Польскага. У гэтай сітуацыі Гродзеншчына ператварылася ў важны стратэгічны плацдарм. Праз яе тэрыторыю рухаліся рэзервы, ажыццяўлялася сувязь і пастаўкі правіянту і іншых прыпасаў. Пры гэтым шырокае распаўсюджанне падчас прасоўвання вайсковых частак на захад атрымалі факты незаконных рэквізіцый і марадзёрства мясцовага насельніцтва. Першыя падобныя выпадкі

[15] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1042, арк. 101.
[16] РДГА, ф. 561, воп. 1, спр. 107, арк. 13.
[17] H. Mościcki, *Powstanie listopadowe na Litwie*, [w:] *Powstanie 1831 r. na Litwie. Wspomnienia uczestników*, Wilno 1931, s. VIII.

адзначаны ў студзені 1831 г., калі жыхары вёсак Гожа і Ратніца падалі скаргу на расійскія часткі, якія бралі ў іх ежу і рэчы, не плацячы грошай[18]. На падобныя факты было вымушана рэагаваць і вышэйшае вайсковае начальства. Згодна з распараджэннем па арміі генерал-фельдмаршала І. Дзібіча ад 20 лютага 1831 г. за выяўленыя факты рабунку цывільных жыхароў прадугледжвалася пакаранне 1000 шпіцрутэнамі без суда, а пры паўторным выпадку — вышэйшая мера[19]. Аднак нават і пасля такіх жорсткіх загадаў факты масавых злоўжыванняў з боку ваенных працягваліся. У Лідскім уездзе казачы полк у шынках і па хатах адабраў фураж, гарэлкі і харчу на суму ў 150 рублёў срэбрам. Памешчыкі Гродзенскага, Кобрынскага, Навагрудскага ўездаў скардзіліся на шматлікія факты канфіскацыі фурманак, сена, коней. З Ваўкавыскага ўезда рапартавалі, што жыхары не маюць сродкаў для падтрымкі камунікацыі паміж Гроднам і Беластокам, бо цалкам пазбаўлены фурманак праз войска[20]. У раёне Слоніма татарскі полк спасвіў лугі і зясеяныя збожжам палі, учыніў гвалт над сялянскімі гаспадаркамі. У тым жа Слонімскім уездзе цалкавітаму спусташэнню была падвергнута сядзіба памешчыка Н. Міхайлоўскага (маёнтак Льнянікі), у якой салдаты забралі не толькі харчовыя запасы, але і іншы непатрэбны хлам. Падобны выпадак адзначаны і ў Свіслачы, дзе быў абрабаваны мясцовы святар, у якога, акрамя свойскай жывёлы, вайскоўцы паквапіліся на боты, кашулі і іншыя хатнія рэчы[21]. У дадатак да рабунку губерні прыклала свае рукі і інтэнданцкая служба арміі. Нават самі рускія чыноўнікі былі вымушаны канстатаваць, што „існуючы парадак харчавання арміі прыводзіў губерню ў абсалютнае змардаванне”[22]. Безумоўна, падобныя дзеянні з боку ваенных толькі садзейнічалі росту напружанасці і канфратацыі ў рэгіёне.

Нягледзячы на ўвесь комплекс прынятых мер, царызму не ўдалося стрымаць развіцця паўстання па-за межамі Царства Польскага. Яно пачалося 14 сакавіка 1831 г. з захопу паўстанцамі Расеняў, што на Жмудзі. Тут быў падпісаны акт паўстання, прасякнуты духам еднасці з Каралеўствам Польскім. Па чарзе, з інтэрвалам у некалькі дзён да Расеняў далучыліся Цяльшэўскі, Шавельскі, Упіцкі, Ковенскі, Вількамірскі, Трокскі, Ашмянскі, Віленскі, Свянцянскі ўезды Віленскай губерні, а таксама частка Мінскай губерні. На месцах паўстанцкі рух знайшоў трывалую сацыяльную базу, актыўна выкарыстоўваўся ваенны і арганізацыйны вопыт былых афіцэраў часоў напалеонаўскіх войн. Ва ўсіх

[18] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1043, арк. 2.
[19] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1042, арк. 901.
[20] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1043, арк. 78.
[21] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 64, арк. 77; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1043, арк. 169.
[22] РДГА, ф. 561, воп. 1, спр. 107, арк. 19.

уездах, дзе перамагала паўстанне, ствараліся часовыя павятовыя ўрадавыя камітэты, якія ў большасці выпадкаў былі вымушаны дзейнічаць паасобку. Не з лепшага боку праявіў тут сябе Віленскі цэнтральны камітэт, які апынуўся адрэзаным у горадзе ад тэатра асноўных падзей і не здолеў аб'яднаць паўстанцкіх сіл.

Першым на тэрыторыі Беларусі паўстаў Ашмянскі ўезд. Падрыхтоўка да выступлення тут вялася са студзеня 1831 г. Яго арганізацыяй па распараджэнню Цэнтральнага Віленскага камітэта павінен быў займацца граф Юзаф Тышкевіч. Але фактычна ён самаадхіліўся ад гэтай ролі і таму арганізацыйнай дзейнасцю займаўся старшыня мясцовага трыбунала Парфірый Важынскі. Для дапамогі ў гэтай справе з Вільні былі дасланы эмісары Ігнат Клюкоўскі (які быў сам родам з гэтых мясцін) і Юзаф Зянковіч[23]. Першымі актыўнымі дзеяннямі змоўшчыкаў у Ашмянскім уездзе сталі напады на паштовыя станцыі з мэтай адабрання зброі, якую мясцовыя чыноўнікі спрабавалі вывезці ў Вільню. Пасля гэтага на сумеснай нарадзе было вырашана прыспешыць час выступлення, хаця яго дэталі да канца распрацаваны не былі. Таму пачатак паўстання ў Ашмянах адбыўся досыць стыхійна. Раніцай 23 сакавіка 1831 г. група змоўшчыкаў (Парфірый Важынскі, Яўстафій Янушкевіч, Каятан Ленартовіч, Юзаф Зянковіч, Вацлаў Янкоўскі, Ігнат Кускоўскі, Напалеон Шуневіч, Юстын Поль, Вінцэнт Бутлер, Ігнат Клюкоўскі і інш.) са зброяй у руках накіравалася да арсенала. Па дарозе да іх далучыліся яшчэ некалькі дзесяткаў чалавек, у тым ліку і ксёндз дамініканскага касцёла Людвік Ясінскі, які сваім прыкладам і заклікамі многіх натхніў на рашучыя дзеянні. Дзякуючы фактару нечаканасці, арсенал удалося захапіць без бою. Далей паўстанцы, „узброіўшы натоўп мужыкоў"[24], выйшлі на вуліцы горада. Пасля перамогі паўстання ўсе жыхары горада (і нават значная чатска яўрэяў) былі прыведзены да прысягі на вернасць Айчыне, якая адраджалася.

Як і ў іншых уездах Віленскай губерні, у Ашмянах быў утвораны паўстанцкі ўрад. Кіраўніком вайсковых сіл стаў уладар Смаргоні граф Караль Пшаздзецкі, які меў ваенны вопыт з кампаніі 1812 г. П. Важынскі ўзначаліў цывільную ўладу. Па ўездзе быў абвешчаны рэкруцкі набор у паўстанцкае войска: з кожнага маёнтка, які не далучыўся да паўстання, уладар павінен быў паставіць двух пешых і 1 вершніка з кожных 20 душ. Акрамя таго шмат сялян далучалася і добраахвотна, тым больш што ім неаднаразова публічна абяцалася воля[25]. Агульная коль-

[23] *Powstanie listopadowe 1830-1831. Dzieje wewnętrzne, militaria, Europa wobec powstania*, Warszawa 1990, s. 398.

[24] В. В. Гарбачова, *Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі*, с. 66.

[25] J. Klukowski, *W powiecie oszmiańskim*, [w:] *Powstanie 1831 r. na Litwie. Wspomnienia uczestników*, Wilno 1931, s. 102.

касць паўстанцаў у хуткім часе дасягнула 2,5 тыс. чалавек, большасць з якіх складалі касінеры. У саміх Ашмянах было арганізавана навучанне навабранцаў. У гэты ж час невялікія атрады пастаянна рабілі паходы ў суседнія ўезды, нападалі на паштовыя станцыі з мэтай разбурэння камунікацый ворага. Так, 28 сакавіка атрад ашмянскіх інсургентаў колькасцю 40 чалавек на чале з шляхціцам Шэльцінгам, напаў на мястэчка Воранава Лідскага ўезда. З паштовай станцыі былі зняты ўсе коні і тым самым адрэзана апошняя нітка, якая звязвала Гродна з Вільняй (да гэтага часу паўстанцамі была абарвана сувязь з Санкт-Пецярбургам і Мінскам)[26]. Справа дайшла да таго, што гродзенскі губернатар быў вымушаны дасылаць свае данясенні „на авось" з людзьмі, якія прабіраліся палявымі шляхамі, абмінаючы населеныя пункты. Пасля захопу Воранава ўзнікла паніка ў самой Лідзе. Лідскі земскі спраўнік, не чакаючы на далейшае разгортаванне падзей, тайна ў лесе закапаў усю канфіскаваную ва ўездзе зброю, каб тая, барані Божа, не трапіла ў рукі паўстанцаў[27]. 31 сакавіка для абароны Ліды ў спешным парадку з Гродна былі скіраваны дадатковыя часткі. Аднак абстаноўка на Лідчыне заставалася досыць нервовай. 7 красавіка камандзір віленскага пяхотнага палка даносіў, што ў гэтым уездзе распачаліся новыя „бунты", якія ўзняў там памешчык Камінскі. У сакавіку 1831 г. быў гатовы далучыцца да паўстання і Навагрудскі ўезд Гродзенскай губерні. Аднак выступленне з-за рашучай інтэрвенцыі царскіх улад было часова адкладзена[28]. У гэты ж час паўстанцкая армія з'явілася і на поўдні губерні. Атрад рэгулярных войск пад камандаваннем генерала Юзафа Дварніцкага, які быў накіраваны польскім урадам на Украіну для дапамогі мясцовым інсургентам, маршам прайшоў праз Слонімскі і Кобрынскі ўезды[29], але іх насельніцтва яшчэ не было падрыхтавана да ўзброенай барацьбы.

Неспакойна ў гэты час было і ў самім Гродне. Па-першае, паўстанцы перарвалі ўсялякую сувязь з Санкт-Пецярбургам і Вільняй, і таму губернскае начальства знаходзілася амаль што ў поўнай ізаляцыі. Па-другое, рэальныя апасенні мясцовых улад выклікалі дзеянні партызан у суседняй Аўгустоўскай губерні, якія канцэнтраваліся ў адлегласці аднаго пераходу ад Гродна. 31 красавіка гараджане былі разбуджаны моцнай кананадай — гэта ўрадавыя войскі дзейнічалі супраць аўгустоўскіх інсургентаў у непасрэднай блізкасці ад горада[30]. І па-трэцяе, паніку выклікала з'яўленне халеры, якая праз Брэст, Кобрын і Слонім даб-

[26] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1102, арк. 3.
[27] Там жа, арк. 2.
[28] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 222, арк. 4.
[29] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 222, арк. 9.
[30] РДГА, ф. 561, воп. 1. спр. 107, арк. 18.

ралася да Гродна 16 красавіка 1831 г.[31] Паратунку ад хваробы не было. Яе ахвярамі сталі тысячы жыхароў губерні.

Для задушэння паўстання, якое ў сакавіку-красавіку ахапіла значную частку Літвы і распаўсюджвалася па тэрыторыі Беларусі, царскія ўлады накіравалі значныя сілы. І. Дзібіч быў вымушаны ахвяраваць 30 тыс. салдат з тэатра асноўных ваенных дзеянняў, каб пагасіць вогнішча нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў гэтым рэгіёне. Значны атрад (1,5 тыс. рэгулярных і казачых войск пры 4 арматах) быў накіраваны супраць ашмянскіх інсургентаў. На вайсковай нарадзе паўстанцы вырашылі адвесці асноўныя сілы ў лес. У горадзе быў пакінуты толькі арыергард пад кіраўніцтвам Ф. Сцяльніцкага. 16 красавіка казакі паспрабавалі авалодаць Ашмянамі, аднак сустрэлі моцнае супраціўленне з боку паўстанцкага атрада, які вырашыў не здаваць горада без бою. Адкінутыя ў горад інсургенты на чале з Ф. Сцяльніцкім зацята бараніліся на вуліцах і плошчах, стралялі з вокнаў дамоў, нанеслі значныя страты праціўніку. Раз'юшаныя казакі злезлі з коней і з шаблямі кінуліся на штурм вуліц і дамоў, не шкадуючы цывільнага насельніцтва. Страты паўстанцаў і мірных жыхароў 16 красавіка склалі каля 350 чалавек[32]. Асноўныя ж сілы ашмянскіх інсургентаў пад кіраўніцтвам К. Пшаздзецкага сканцэнтраваліся ў Вішнеўскай пушчы. Супраць іх з Вільні быў накіраваны дадатковы атрад генерала Паўла Севасц'янава, які атакаваў партызан каля мястэчка Рум 18 красавіка. У гэтым баі паўстанцы, значную частку якіх складалі касінеры, панеслі значныя страты. Захавалася толькі невялікае ядро атрада, астатняя ж частка людзей разышлася па хатах. Акрамя вышэйзгаданага фарміравання Караля Пшаздзецкага ў Ашмянскім уездзе ў сакавіку-красавіку дзейнічалі два атрады (120 і 60 чалавек адпаведна)[33], аднак аб іх складзе, дыслакацыі і далейшых дзеяннях бракуе дакладнай інфармацыі.

Што тычыцца непасрэдна тэрыторыі Гродзенскай губерні, то ў ёй паўстанцкі рух меў шэраг асаблівасцей. Адным з галоўных адрозненняў ад Віленшчыны і Міншчыны было тое, што тут узброеная барацьба разгортвалася не па асобных уездах, а ў асноўным канцэнтравалася (асабліва на першым этапе) у адным месцы. Такім месцам у губерні, дзякуючы свайму выключнаму геаграфічнаму становішчу, аддаленасці ад месцаў дыслакацыі царскіх вайсковых сіл і наяўнасці сацыяльнай базы для ўзняцця паўстання ў асобе ляснічых, вартаўнікоў і іншых катэгорый служачых стала Белавежская пушча. Менавіта тут у краса-

[31] РДГА, ф. 561, воп. 1. спр. 107, арк. 13-14.

[32] Ф. Смит, *История польского возстания и войны 1830 и 1831 г.*, т. 2, Санкт-Петербург 1863, с. 143.

[33] *Powstanie listopadowe 1830-1831. Dzieje wewnętrzne, militaria...*, s. 402.

віку-чэрвені былі акумуляваны паўстанцкія сілы ўсіх навакольных (і не толькі) уездаў.

Падрыхтоўка да паўстання ў Белавежскай пушчы вялася з зімы 1831 г. У Гродне каардынацыяй дзеянняў і вярбоўкай добраахвотнікаў займаўся брэсцкі маршалак дваранства Караль Нямцэвіч (пляменнік Юльяна Урсына Нямцэвіча). Яго асоба выклікала падазрэнне ў царскіх улад (працяглы час знаходзіўся пад наглядам земскай паліцыі), а адразу ж пасля пачатку паўстання ў Варшаве па асабістым загадзе вялікага князя Канстанціна ён быў пераведзены пад нагляд у Гродна. У гэты ж час, пад кіраўніцтвам акруговага ляснічага Яўгена дэ Ронке ў белавежскіх лясах, у Зубрыным куце адбываліся патаемныя сходкі, назапашванне зброі і харчовых запасаў, канцэнтрацыя сіл. Тайная паўстанцкая арганізацыя падтрымлівала сувязь з Віленскім камітэтам. У лютым 1831 г. прадстаўнікі гродзенскага падполля Юзаф Шчапінскі і Якуб Шрэтар, вартаўнік Белавежскай пушчы, прысутнічалі на нарадзе ў Вільні, якая была арганізавана для прадстаўнікоў павятовых камітэтаў[34].

Пасля прыбыцця ў Гродна на пачатку красавіка 1831 г. дадатковых вайсковых сіл, найбольш „нядобранадзейным" раёнам губерні з'яўляўся г. Ваўкавыск. Менавіта туды былі накіраваны памкненні многіх жыхароў губерні „ў горад Ваўкавыск (...) уезд каторага, з слоў многіх, рашуча рыхтуецца выбухнуць"[35]. Боязь улад была небеспадстаўнай. Вось як характарызаваў настроі, што панавалі на Ваўкавышчыне, падпалкоўнік Прыклонскі: „Амаль усе жыхары гэтага ўезда, не выключаючы і чыноўнікаў, якія абавязаны прысягаю расійскаму прастолу, гатовы яе парушыць пры малейшым поспеху нападу мяцежнікаў на Ваўкавыск"[36]. А ў гэты час атрады партызан, якія фарміраваліся ў суседніх лясах, вялі актыўную вярбоўку прыхільнікаў па ўсім наваколлі. Гэты факт быў устаноўлены ваўкавыскім земскім спраўнікам, які даносіў, што „ў Белавежскім лесе знаходзіцца зборышча невядомых людзей, якія (...) раз'язджаюць і намаўляюць да сябе чэрнь і іншага кшталту асоб"[37]. Дзеля большага заахвочвання сялян паўстанцы выкарыстоўвалі тэзіс „будзе Польшча, будзеш вольны"[38]. У цэлым, сяляне вакол пушчы (як казённыя, так і прыватнаўласніцкія) падтрымалі паўстанне, якое ў хуткім часе пачалося ў гэтым рэгіёне. Як адзначаў старэйшы ляснічы А. Кавальскі, „сяляне навакольных вёсак больш ці менш удзельнічалі разам

[34] В. Гарбачова, *Паўстанне 1830-1831 гг. у лёсе Ігната Дамейкі*, [у:] *Ігнат Дамейка — светач сусветнай цывілізацыі: Матэрыялы VI Карэліцкіх чытанняў*, Мінск 2002, с. 17.

[35] РДГА, ф. 561, воп. 1, спр. 107, арк. 16.

[36] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 24, арк. 2.

[37] Там жа, ф. 4, воп. 1, спр. 20, арк. 3.

[38] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 64, арк. 197.

са стральцамі ў мяцяжы па Белавежскай пушчы, і ўсе яны пры з'яўленні рускіх войск пакідалі свае хаціны і хаваліся ў лесе разам з жонкамі і дзецьмі"[39]. Але разам з тым неабходна адзначыць, што ўдзел у паўстанні гэтай сацыяльнай групы незаўсёды быў добраахвотным, паколькі даволі часта да інсургентаў іх накіроўвалі іх непасрэдныя гаспадары.

Нягледзячы на ўсе тыя папярэджанні, што паступалі з Ваўкавышчыны, Кобрыншчыны і іншых раёнаў Белавежскай пушчы, вядомасць аб пачатку там збройнага чыну заспела губернскія ўлады знянацку. „Я быў уражаны, — пісаў чыноўнік у Санкт-Пецярбург, — весткай аб новым, бліжэйшым, і больш небяспечным бунце ў межах Гродзенскай губерні ў Ваўкавыскай Белавежскай пушчы"[40]. У дадзеным выпадку чыноўнік памыляўся: паўстанне распачалося не ў ваўкавыскай, а ў кобрынскай частцы белавежскіх лясоў. Тым не менш, дзейнасць паўстанцаў далёка выходзіла за межы аднаго ўезда. Непасрэдным штуршком да пачатку ўзброенай акцыі паслужылі ўцёкі з-пад нагляду ў Гродна К. Нямцэвіча і іншых змоўшчыкаў прыкладна 7 красавіка 1831 г. Роўна праз тыдзень у пушчы адбылося прыняцце Акта канфедэрацыі[41]. Менавіта брэсцкі маршалак дваранства, разам з былым афіцэрам напалеонаўскай арміі Янам Жылінскім узначалілі цывільную і ваенную паўстанцкую ўлады.

Важную ролю ў справе падрыхтоўкі выступлення і заахвочвання навакольнага насельніцтва да ўдзелу ў ім адыгрывала каталіцкае (і часткова ўніяцкае) духавенства. Адной з форм падобнай дзейнасці была агітацыя. Так, у снежні 1830 г., калі паўстанне на ўсход ад Нёмана яшчэ не распачалося, у Гродзенскай губерні па даносе рускага афіцэра быў арыштаваны святар Прывальскага прыхода С. Вайткевіч, які „стращал прихожан" і за гэта быў аддадзены пад ваенна-палявы суд[42]. Яшчэ больш актывізавалася духавенства ў плане агітацыі і прапаганды пасля пачаткау паўстання ў Літве і Беларусі. Як сведчаць данясенні расійскіх улад ксяндзы даволі часта з амбона звярталіся да сваіх прыхаджан з заклікамі падтрымаць вызваленчую барацьбу, зачытвалі паўстанцкія адозвы, служылі ўрачыстыя імшы і г.д. Духавенста актыўна прымала ўдзел у падрыхтоўцы выступленняў у розных мясцовасцях. Так, напрыклад, згодна з афіцыйнымі данымі, уніяцкі святар Андрэй Клышынскі і каталіцкі ксёндз Пануфнік з Шарашова прымалі актыўны ўдзел у нарадах падчас падрыхтоўкі выступлення ў пушчы, а пасля падтрымлівалі сталыя кантакты з белавежскімі інсургентамі. Акрамя таго, Па-

[39] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 63, арк. 6.
[40] РДГА, ф. 561, воп. 1, спр. 107, арк. 20.
[41] В. В. Гарбачова, *Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі*, с. 85.
[42] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 846, арк. 1, 8.

нуфнік быў выкрыты ў тым, што абяцаў „узбунтаваць" (далучыць да ўзброенай барацьбы) Сялецкую парафію. У саміх белавежскіх лясах, у спецыяльна пабудаваным для правядзення набажэнстваў будане, дзейнічаў клірык марыянскага ордэна С. Гарчынскі. Туды ж некалькі разоў з мэтай прывядзення да прысягі прыязджалі ўніяцкія святары Ф. Жалязоўскі і Б. Плюцынскі з Ваўкавыскага ўезда[43]. Сваім словам і прыкладам каталіцкае і ўніяцкае духавенства натхняла да ўзброенай барацьбы розныя слаі грамадства, часцяком асабіста прымаючы ўдзел у гэтай барацьбе. Найбольш яскравым прыкладам тут з'яўляецца дзейнасць манахаў з Бярозы-Картузскай Пружанскага ўезда. Духоўнымі асобамі гэтага кляштара быў арганізаваны асобны атрад (на чале з манахам Ламбертам Плюшчэўскім), да якога павінны былі далучыцца і свецкія асобы. У планы фарміравання ўваходзіла злучэнне з паўстанцамі Белавежскай пушчы. Але ім не дадзена было спраўдзіцца, бо на месцы збору на іх напаў і разагнаў атрад царскіх войск. Іншы прыклад актыўнай дзейнасці манахаў падчас паўстання гэта францішканскі кляштар у Шэйбакполі, манахі якога былі абвінавачаны ўладамі ў нападзе на грашовую пошту ў Ваўкавыскім уездзе[44]. Апрача таго, ксяндзы былі ў складзе большасці вядомых паўстанцкіх атрадаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. Пераважна яны выконвалі функцыі капеланаў. Найбольш яскравым прыкладам тут з'яўляецца асоба ксяндза Адама Логі — капелана ў корпусе Дэзідэры Хлапоўскага, якога ўлады і самі паўстанцы лічылі адной з ключавых фігур, якая натхняла іх на ўзброеную барацьбу. Не менш вядомай з'яўляецца асоба ксяндза Людвіка Ясінскага, які з касцельнай харугвай у руках павёў жыхароў Ашмян на рускі гарнізон, а пасля ўдзельнічаў у сутычках і бітвах пад Вільняй, Вілейкай, Глыбокім і Кушкарышкамі.

Пачатак мая — гэта час найбольшай актыўнасці белавежскіх партызан. У сваёй дзейнасці яны выкарыстоўвалі розныя формы барацьбы: захопы харчовых і іншага кшталту транспартаў расійскіх войск, спусташэнне паштовых станцый, напады на невялікія атрады і пікеты, а таксама замінaлі камунікацыям паміж вайсковымі часткамі і населенымі пунктамі. Так, напрыклад, 1 мая паўстанцы напалі на транспарт з 29 вазоў з харчам для рускіх войск, што накіроўваўся з Ваўкавыскага ў Брэсцкі ўезд[45]. 3 мая імі каля вёскі Рудні быў захоплены велізарны абоз (больш за 400 фурманак), які меў пры сабе ўзмоцненую ахову. Падчас сутычкі адзін афіцэр рускай арміі і некалькі шарагоўцаў былі забіты, астатнія трапілі ў палон, а пасля былі адпушчаны. У руках паў-

[43] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 64, арк. 228-230.
[44] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1239, арк. 55.
[45] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 18, арк. 4.

станцаў апынулася 125 коней і ўсе вазы з запасамі[46]. На наступны дзень здабычай белавежскіх інсургентаў стаў іншы транспарт (каля тоны мукі і 2,5 т зерня). Атрад Яна Жылінскага падчас пераходу з Белавежскіх лясоў у Беластоцкую вобласць на пачатку адбіў вялікі абоз (150 фурманак) са шпітальнымі рэчамі, а потым напаў на рускую частку, што знаходзілася ў Гарадку[47]. І такіх прыкладаў можна прывесці мноства.

Пасля атрымання першых звестак аб актывізацыі партызан у пушчы, на пачатку мая супраць іх былі накіраваны два расійскія карныя атрады пад камандаваннем падпалкоўнікаў Горскага і Сарабіі. Яны атакавалі паўстанцаў каля вёскі Ялоўна і захапілі іх базу у Каралеўскай Альтанцы. Адначасова з гэтым у заходнюю частку лесу на дапамогу ім быў высланы генерал Ліндэн, які сканцэнтраваў свае сілы каля вёскі Гайнаўкі. Амаль што бязмежныя прасторы пушчы давалі магчымасць партызанам, падзяліўшы свае сілы, пазбягаць сутыкненняў з атрадамі праціўніка. Зразумеўшы дарэмнасць сваіх намаганняў разбіць інсургентаў у баі, рускае камандаванне прыбегла да іншай тактыкі: яны прымусілі палонных інсургентаў паказваць патаемныя сховішчы і сцежкі, тым самым пазбаўляючы іх інфраструктуры і баз дыслакацыі. Акрамя таго, сярод мясцовых памешчыкаў з Ваўкавыскага ўезда знайшлося некалькі асоб, якія з уласнай ахвоты згадзіліся дапамагчы ваеннаму камандаванню ў выкрыцці сваіх суседзяў, якія далучыліся да паўстанцаў[48].

Ваенныя аперацыі былі не адзіным спосабам барацьбы царызму супраць паўстання. Гэтым мэтам таксама служылі шматлікія царскія ўказы, якія, з аднаго боку, павінны былі застрашыць патэнцыяльных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху і тых хто ўжо змагаўся са зброяй у руках, а з іншага, шляхам „уседаравальнай" амністыі адцягнуць ад барацьбы асоб, якія адчувалі няпэўнасць. 22 сакавіка быў выдадзены царскі ўказ, які прадугледжваў цэлы комплекс падобных мерапрыемстваў. Сярод іншага, у ім прадпісвалася ўсіх шляхціцаў і дваран, якія будуць схоплены са зброяй у руках, судзіць ваенна-палявым судом з выкананнем прысуду на месцы[49]. І гэта былі не пустыя пагрозы. На пачатку красавіка маёрам Ожыгавым каля м. Мерач, што ў Віленскай губерні, быў затрыманы атрад паўстанцаў з 13 чалавек, што прабіраўся ў Лідскі павет. Па зацвярджэнню ваенна-палявога суда, шляхціц (магчыма гэта быў К. Багдановіч, які стаяў на чале

[46] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 64, арк. 200.

[47] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 191, арк. 72; І. Шпілеўскі, Л. Бабровіч, *Сынхроністычная табліца падзей паўстання на Беларусі, Літве і Польшчы ў 1830-1831 г.*, „Наш край", 1929, № 10, с. 36.

[48] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 24, арк. 3.

[49] *Полное собрание законов Российской Империи* (далее: *ПСЗ*; выд. другое), т. 6, № 4444.

гэтай выправы) быў расстраляны ў Гродне 9 красавіка а чацвёртай гадзіне раніцы. Па водгуках сведкаў гэтая экзекуцыя мела вялікі рэзананс у горадзе[50]. У маі 1831 г. у Свіслачы генерал-лейтэнантам Яўгенам Галавіным зноў жа з мэтай застрашэння быў павешаны шляхціц-паўстанец Лядзінскі[51]. Смяротных прысудаў у 1831 г. было вынесена досыць вялікая колькасць, але ў большасці выпадкаў падчас канфірмацыі яны замяняліся больш лагодным пакараннем. Да палонных таксама прымяняліся цялесныя пакаранні і катаванні. Разам з тым, указ ад 22 сакавіка, а таксама аналагічныя акты ад 6 мая і 4 ліпеня прадугледжвалі вызваленне ад пераследавання як паўстанцаў, так і іх маёмасці ў выпадку добраахвотнай здачы першых прадстаўнікам ваеннай ці цывільнай улады. Згодна з палажэннем ад 4 ліпеня дараванне распаўсюджвалася і на асоб (за выключэннем галоўных завадатараў і кіраўнікоў паўстання), якія змагаліся супраць законнай улады са зброяй у руках.

Пры дапамозе падобных метадаў і якаснай перавагі, рускім войскам даволі хутка ўдалося б згасіць полымя ўзброенай барацьбы на Гродзеншчыне, калі б не дапамога з боку Каралеўства Польскага. У красавіку 1831 г. польскі Нацыянальны ўрад неаднойчы спрабаваў накіраваць у ахопленыя полымем узброенай барацьбы Літву і Беларусь армейскія часткі. Прарвацца ўдалося толькі невялікаму корпусу (820 чалавек) пад камандаваннем ген. Д. Хлапоўскага. Тым не менш, з гэтымі нязначнымі сіламі генералу ўдалося выціснуць з Белавежскай пушчы атрады царскіх войск і ўзяць даволі вялікі палон (значная частка салдат і афіцэраў з Літоўскага корпуса далучылася да польскага генерала). Зранку 12 мая Хлапоўскі распачаў свой трыумфальны марш па Гродзеншчыне. З усіх бакоў да яго сцякаліся партызанскія атрады, далучаліся сяляне, як паасобку, так і цэлымі групамі. Праходзячы па тэрыторыі Гродзенскай губерні, Д. Хлапоўскі выдаў два звароты, у якіх заклікаў насельніцтва „кідаць хаты і брацца за зброю, каб з дапамогай сваіх братоў-палякаў дамагчыся аднаўлення польскай айчыны і былых свабод, адабраных Расіяй 37 год таму”[52]. У ноч з 13 на 14 мая асноўныя сілы польскага генерала спыніліся ў ваколіцах Свіслачы. Такі маршрут быў невыпадковы. Хлапоўскі ў суправаджэнні невялікага эскорта накіраваўся ў мястэчка, каб праз некаторы час вярнуцца разам з уладаром гэтай мясцовасці. Тыя пару гадзін, што былі праведзены Хлапоўскім у Свіслачы, карэнным чынам змянілі яе лёс і лёс уладара. На кароткай нарадзе, якая адбылася ў мястэчку, гаспадару мясцовасці Тадэвушу Тышкевічу была прапанавана пасада цывільнага начальніка ўсёй Літвы. Выбар

[50] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп 1, спр. 1, арк. 6; РДГА, ф. 561, воп. 1, спр. 107, арк. 10.

[51] НГАБ у Гродне, ф.1, воп. 27, спр. 65, арк. 51.

[52] И. Воронков, *Восстание 1830-1831 гг. в Белоруссии*, „Вестник Московского университета. Серия IX, история”, 1966, № 2, с. 54.

быў зроблены невыпадкова, бо на той час імя Т. Тышкевіча, актыўнага ўдзельніка паўстання 1794 г. і напалеонаўскага паходу 1812 г. было вядома ва ўсёй Літве і Беларусі. Як адзначаў біёграф Т. Тышкевіча даследчык Валеры Калінка, такі выбар быў абумоўлены імкненнем „прыкрыць слабасць сваіх сіл імем вядомага чалавека”[53]. На наступны дзень корпус Хлапоўскага рушыў далей у кірунку Рудні, пакідаючы ў пушчы значныя партызанскія сілы на чале з Я. Шрэтарам.

Каб увесці ў зман пераўзыходзячага ў сіле праціўніка, Хлапоўскі ўвесь час змяняў напрамак свайго руху, пагражаючы адначасова Гродну і Слоніму, дзе ў той час знаходзіўся яго швагер — вялікі князь Канстанцін. Правёўшы наступную ноч у Мсцібаве, паўстанцкі корпус 16 мая праз Рось і Воўпу, абмінаючы Ваўкавыск і маршыруючы цэлы дзень, пераправіўся праз Нёман каля Зэльвян. Не даючы сваім войскам ані дня перадыху, Хлапоўскі рушыў далей і далей. 17 мая непадалёк ад Ражанкі да яго далучыўся партызанскі атрад Адама Солтана, які быў утвораны ў Слонімскім уездзе[54]. Даведаўшыся, што Ліду ахоўвае параўнальна невялікі гарнізон, Дэзідэры Хлапоўскі мяняе накірунак і 18 мая падыходзіць да горада. Атакаваць Ліду ў лоб ён не рашыўся, а пайшоў на хітрасць: уначы некалькі рот абышлі горад збоку і зранку пачалі інтэнсіўную страляніну з боку Вільні. Дэзарыентаваны камандзір гарадскога гарнізона з дзвюма ротамі і дзвюма гарматамі адступіў у поле. Але тут ён быў нагнаны паўстанцкім корпусам і пасля непрацяглага бою склаў зброю непадалёк ад лесу, які даў магчымасць частцы рускіх выратавацца. Частка ж палонных, якія паходзілі з заходніх губерняў імперыі, зноў жа ўлілася ў паўстанцкія шэрагі[55]. Ліда сардэчна вітала інсургентаў: манахі-піяры наладзілі святочную вячэру, з усяго наваколля дастаўляліся харчовыя прыпасы, моладзь розных сацыяльных груп далучалася да корпуса. Далейшы шлях Хлапоўскага пралягаў ужо па-за межамі Гродзеншчыны. За той час, што ён знаходзіўся на яе тэрыторыі, атрад прайшоў каля 100 міль, тры разы ўдзельнічаў у сутычках і ва ўсіх атрымаў перамогу, здабыў 3 гарматы, каля 2000 карабінаў, узяў у палон 2000 салдат і 20 афіцэраў[56], а сам корпус з 820 чалавек павялічыўся ў некалькі разоў да 5 тыс.[57], што сведчыць аб актыўнай падтрымцы паўстання з боку мясцовых жыхароў.

Актыўныя дзеянні партызан Літвы, Беларусі, Украіны, а таксама няз-

[53] W. Kalinka, *Żywot Tadeusza Tyszkiewicza*, Poznań 1853, s. 146.

[54] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 222, арк. 23; D. Chłapowski, *Pamiętniki*, cz. 2: *Wojna roku 1830-1831*, Poznań 1899, s. 62.

[55] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 17, арк. 5; А. К. Пузыревский, *Польско-русская война 1831 г.*, Санкт-Петербург 1890, с. 274.

[56] W. Kalinka, *Jenerał Dezydery Chłapowski*, Poznań 1885, s. 120.

[57] Ф. Смит, *История польского возстания и войны 1830 и 1831 г.*, с. 465.

дольнасць рускай арміі ўжо на працягу некалькіх месяцаў задушыць нацыянальна-вызваленчую барацьбу на тэрыторыі Каралеўства Польскага, паставілі пад пагрозу тэрытарыяльную еднасць Расійскай імперыі. У маі 1831 г. Мікалай I асабіста накідаў алоўкам панічную нататку на французскай мове, у якой выказаў гатоўнасць ахвяраваць землямі за Віслай і Нарвай[58]. У гэты ж час лёс паўстання ў Літве і Беларусі вырашаўся пад Вільняй, куды накіраваў свой корпус Д. Хлапоўскі на злучэнне з больш моцным атрадам польскай арміі пад камандаваннем Антона Гелгуда.

Што тычыцца непасрэдна тэрыторыі Гродзеншчыны, то і пасля адыходу Хлапоўскага тут не згасла полымя нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Месцам дыслакацыі новага атрада ў Белавежскай пушчы пад кіраўніцтвам Я. Шрэтара была абрана Светлячанская дача, што непадалёк ад Свіслачы. Тут партызаны адчувалі сябе поўнымі гаспадарамі: рабілі заказы яўрэям на пастаўку харчовых запасаў і лекаў, забараняялі адпраўляць падводы на патрэбы рускай арміі, выдавалі ахоўныя білеты рускім палонным, бралі з сабой майстравых людзей з мястэчка і г.д. Падчас аднаго з візітаў імі быў захоплены і выгнаны з мястэчка этапны начальнік падпаручык Мамлееў. Напрыканцы мая фарміраваннем Шрэтара былі здзейснены два напады на рускія войскі каля вёскі Галены. Падчас першай акцыі ў палон былі захоплены 2 шарагоўцы царскіх войск. У другі раз партызаны сутыкнуліся з камандай улан, якая налічвала 25 чалавек. У бойцы 1 рускі афіцэр быў забіты, 10 чалавек трапіла ў рукі паўстанцаў. Іншым значным поспехам белавежскіх інсургентаў можна лічыць захоп Старадварэцкай паштовай станцыі, дзе ў іх рукі, сярод іншых трафеяў, трапіла 100 тыс. рублёў. Зразумела, што ўлады не маглі пакінуць дзейнасці гэтага атрада без увагі. На гэты раз у Белавежскія лясы былі накіраваны 3 спецыяльныя карныя корпусы пад кіраўніцтвам Галавіна, Болена і Ліндэна, якія мелі пры сабе гарматы. 26 мая атрад генерал-маёра Галавіна атакаваў Светлячанскую дачу. Партызаны аказалі ўпартае супраціўленне, праявіўшы не толькі мужнасць, але і разважлівасць (выявілася вывучка інструктараў, якія былі пакінуты Хлапоўскім), чым нават выклікалі ўхваленне з боку ворага[59]. Страты рускіх у гэтай бойцы склалі 5 чалавек забітымі і 6 параненымі, страты ж паўстанцаў ацэньваліся рускімі прыкладна ў 30 чалавек, у палон трапіў толькі адзін чалавек. Усе прыпасы, што знаходзіліся ў Светлячанскай дачы былі рэквізаваны, а сама дача спалена. На наступны дзень рускія працягнулі праследаванне партызан. Фактычна, у выніку гэтага карнага рэйду атрад Шрэтара перапыніў сваю актыўную дзей-

[58] Ю. Борисёнок, *Хозяин мятежного края. Штрихи к образу фельдмаршала Паскевича*, „Родина", 1994, № 12, с. 53.

насць, распаўшыся на больш дробныя часткі. Узброеную барацьбу працягвалі далёка не ўсе з іх.

Падчас гэтай буйнамаштабнай акцыі расійскімі войскамі было ліквідавана яшчэ адно партызанскае фарміраванне, што дзейнічала пад кіраўніцтвам памешчыка гродзенскага ўезда Казіміра Гоўвальда. Гэты атрад складаўся ў асноўным з прыгонных сялян, якія былі мабілізаваны сваім панам[60]. На пачатку дзейнасці Гоўвальд з людзьмі далучыўся да іншых партызанскіх камандзіраў (Я. Жылінскі, Я. дэ Ронке). Прыкладна 7-8 мая ён фарміруе ўласны атрад і пачынае самастойную дзейнасць, размясціўшыся на востраве ў балоце непадалёк ад свайго маёнтка Лукі (Ваўкавыскі ўезд), дзе „ўчыніў асабліва немалыя абозы, якія праходзілі побач”[61]. У 20-х чыслах мая падпалкоўнік Горскі атакаваў атрад Казіміра Гоўвальда і толькі рэчка Нарва, у якую паўстанцы кінуліся, пачуўшы стрэлы, выратавала іх ад куль і шабель уланаў. Як і ў іншых падобных выпадках, паўстанцкі склад з харчовымі прыпасамі быў разрабаваны, а ўсё іншае, уключаючы дом К. Гоўвальда, спалена[62].

Чэрвень 1831 г. — гэта час спаду паўстанцкай актыўнасці на Гродзеншчыне. Толькі ў раёне Сапоцкіна адбываліся сутычкі паміж урадавымі войскамі і інсургентамі. Прыкладна 6 чэрвеня партызанскі атрад (хутчэй за ўсё з Аўгустоўскай пушчы) напаў на кавалерыйскі раз’езд і выціснуў яго з мястэчка. Супраць партызан быў накіраваны з Гродна атрад генерал-маёра Аляксандра Яхонтава (каля 1,5 тыс. пры 2 гарматах), які атакаваў паўстанцаў на Ліпскім тракце. Адстрэльваючыся, тыя адступілі да Сапоцкіна, а потым былі прымушаны адыходзіць далей. І толькі падарваўшы пасля сабе мост праз канал, партызаны апынуліся ў бяспечным месцы. У гэтым баі рускія згубілі аднаго чалавека забітым і 5 параненымі. Страты ж праціўніка яны ацэньвалі ў 70 чалавек[63].

Наступны этап паўстання на Гродзеншчыне звязаны з прасоўваннем праз тэрыторыю Гродзенскай губерні польскіх войск пад камандаваннем Генрыка Дэмбінскага, а таксама дзейнасцю новых партызанскіх атрадаў. Пасля паражэння асноўных паўстанцкіх сіл пад Вільняй у чэрвені 1831 г., большая частка рэгулярнага польскага корпуса пад камандаваннем А. Гелгуда і тыя партызаны, што далучыліся да яго, перайшлі мяжу з Прусіяй і склалі там зброю. Сваю дзейнасць супраць урадавых войск працягваў толькі невялікі (3800 чалавек і 6 гармат) атрад ген. Г. Дэмбінскага. На ваеннай нарадзе ў Панявежы ім было прынята

[59] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 41, арк. 2.
[60] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 64, арк. 198.
[61] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 64, арк. 259.
[62] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 41, арк. 3.
[63] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 46, арк. 2, 3.

рашэнне прабівацца ў Каралеўства Польскае. Дэмбінскі добра разумеў усю цяжкасць, якую несла выправа праз край, які з усіх бакоў быў атачаны войскамі ворага. Аднак, рашаючыся на гэты крок, ён спадзяваўся на падтрымку мясцовага насельніцтва. І ў гэтым ён не пралічыўся. Яго маршрут праходзіў праз Смаргонь, Крэва, Альшаны і далей на Белавежскую пушчу.

З набліжэннем войск Дэмбінскага Гродзенчшчына зноў актывізавалася. Сярод іншых, вызначаўся Навагрудскі ўезд, дзе падрыхтоўку да ўзброенага выступлення вёў маршалак мясцовага дваранства Юзаф Кашыц, удзельнік кампаніі 1812 г. Касцяк партызанскага атрада фарміраваўся ў лясах, што прылягалі да мястэчка Гарадзішча[64]. 7 ліпеня паўстанцы атакавалі Гарадзішча і тым самым „зверглі законны парадак ва ўездзе". На наступны дзень навагрудскі атрад, праз фальварак Радзюкі, накіраваўся да мястэчка Беліцы (Лідскі ўезд), дзе пасля разбіцця этапнай каманды партызаны дазволілі мясцовым жыхарам разабраць прадукты з харчовага склада. У Беліцы Кашыц падзяліў свае сілы: асноўная іх частка пад яго началам падалася на Навагрудак, другая — пад кіраўніцтвам М. Мержаеўскага — заняла Дзятлава, дзе захапіла пошту. У Навагрудку паўстанцаў на вуліцах вітала вялікая колькасць народу, урачыста білі званы ўсіх касцёлаў. 10-12 ліпеня ўездны горад знаходзіўся ў руках партызан. На прыкладзе некаторых уездаў Віленскай і Мінскай губерняў Кашыц паспрабаваў арганізаваць тут рэкруцкі збор. Па ўсіх парафіях былі разасланы адозвы да памешчыкаў з патрабаваннем паставіць з кожных 10 душ аднаго касінера[65]. Аднак землеўладальнікі праігнаравалі гэтыя распараджэнні. Тым не менш у шэрагі навагрудскіх паўстанцаў улілася вялікая колькасць добраахвотнікаў розных сацыяльных груп, у тым ліку вучні дамініканскай гімназіі. У сваю чаргу, Кашыц таксама аддзячыў народу, спаліўшы паперы ніжняга земскага суда, брыгаднай канцылярыі, гарадской паліцыі, ратушы, павятовага маршалка дваранства і вызваліўшы арыштантаў з астрога. Харчовы склад, як і ў Беліцы, быў аддадзены на расправу гараджанам.

У гэты час да Навагрудка набліжаўся корпус Г. Дэмбінскага. 10 ліпеня ён спыніўся ў Іўі. Адсюль польскі генерал адаслаў да Навагрудка 140 чалавек на злучэнне з Кашыцам. 12 ліпеня паўстанцы пакінулі горад у кірунку Дзятлава, дзеля аб'яднання з Мержаеўскім і Дэмбінскім, які паспеў каля Іўя фарсіраваць Нёман. Рускія войскі толькі 16 ліпеня ўзялі пад свой кантроль Навагрудак.

[64] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 64, арк. 301.
[65] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 999, арк. 360.

Іншым паўстанцкім атрадам, які актывізаваў сваю дзейнасць пры набліжэнні корпуса Дэмбінскага, было фарміраванне Стэфана Незабітоўскага і Антона Бронскага, якое дзейнічала ў Слонімскім уездзе. Асноўным месцам арганізацыі новага атрада стаў маёнтак Р. Пржэцлаўскага на беразе ракі Шчары. Менавіта тут быў зборачны пункт слонімскіх інсургентаў, да якіх таксама далучылася шмат з тых, хто раней уваходзіў у іншыя паўстанцкія атрады. Па ацэнцы самога Р. Пржэцлаўскага большасць слонімскіх інсургентаў складалі асобы ніжэйшага саслоўя (больш за 60 асоб) і толькі 22 былі шляхецкага паходжання[66]. Нічым значным гэты атрад не паспеў вызначыцца і 15 ліпеня ў Дзярэчыне далучыўся да Г. Дэмбінскага. Туды ж прыбылі і рэшткі белавежскіх паўстанцаў. Далейшы маршрут Дэмбінскага ляжаў праз Зэльву і Ізабелін, Поразава і Новы Двор у кірунку Каралеўства Польскага. Але нават перайшоўшы мяжу і далучыўшыся да рэгулярнай польскай арміі, гродзенскія паўстанцы захавалі там сваё тэрытарыяльнае адзінства. Напрыклад, навагрудскія інсургенты амаль што ў поўным складзе ўвайшлі ў 13 уланскі полк пад камандай палкоўніка Яновіча, а слонімскі атрад далучыўся да 3-га палка стральцоў. У Варшаве напрыканцы ліпеня адбыліся выбары дэпутатаў ад зямель былога ВКЛ у сейм. Ад Навагрудскага ўезда паслом быў абраны Юзаф Кашыц, ад гродзенскага — Аляксандр Веляпольскі (падчас паўстання знаходзіўся з місіяй у Лондане), Слонімшчыну прадстаўляў Яўген Брэза, а Ашмянчыну — Юзаф Зянковіч[67]. Аднак нядоўгай была іх дзейнасць у гэтым органе. 25 жніўня армія Івана Паскевіча распачала штурм Варшавы. 27 жніўня 1831 г. польская сталіца пала, паўстанне пацярпела паражэнне.

Пасля адыходу асноўных сіл паўстанцаў за мяжу ўзброеная барацьба на Гродзеншчыне не перапынялася. Але ў адрозненні ад папярэдняга этапу дзеянні партызан ужо не мелі такой яркай нацыянальна-вызваленчай афарбоўкі, а дзе-нідзе нават набывалі сацыяльны характар. Віленскі генерал-губернатар напрыканцы жніўня даносіў, што ў davеraных яму губернях паўстанцы ў розных месцах нападаюць на панскія двары, вёскі і шынкі, і не толькі рабуюць іх, але нават вешаюць аканомаў і арандатараў[68]. Гэта можна добра прасачыць на прыкладзе Ваўкавыскага ўезда, дзякуючы рапарту мясцовага земскага спраўніка, што быў складзены ім на імя губернатара Міхаіла Мураўёва. Так, згодна з гэтай крыніцай, пасля адыходу войска Дэмбінскага за межы губерні,

[66] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 71, арк. 13.

[67] P. Puciata, *Skład i działalność reprezentacji ziem zabranych na sejmie 1830/31 r.*, [w:] *Księga pamiątkowa koła historyków słuchaczy uniwersytetu S. Batorego*, Wilno 1933, s. 236-237.

[68] И. Воронков, *Восстание 1830-1831 гг. в Белоруссии*, „Вестник Московского университета. Серия IX, история”, 1966, № 2, с. 56.

на Ваўкавышчыне ў ваколіцах Поразава, Новага Двара і Лыскава дзейнічаў атрад князя Адольфа Гедройца (каля 350 чалавек). Гэты атрад неаднаразова бываў ва ўзгаданых мясцовасцях, а ў Лыскаве забіў мясцовага ключвойта — адстаўнога ўнтэр-афіцэра. Супраць партызан Гедройца накіроўваліся рускія войскі і князь быў узяты ў палон[69]. Па-другое, у жніўні месяцы ў лясах каля Рудні і Добрай Волі неаднаразова з'яўляўся атрад пад кіраўніцтвам нейкага Бягальскага або Яловіча. Людзьмі з гэтага атрада быў забіты аканом фальварка Добрая Воля. Па-трэцяе, у рапарце ўзгадваецца фарміраванне шляхціца Дабравольскага, якое ў ваколіцах Поразава і Новага Двара пазбавіла жыцця некалькіх яўрэяў. Найбольшыя непрыемнасці, пэўна, даставіў царскім уладам атрад Курка (альбо Курыка), які ў Ваўкавыскім і Гродзенскім уездах захапіў некалькі паштовых станцый і тым самым нанёс значныя матэрыяльныя страты. Акрамя адзначаных атрадаў у гэты час на Ваўкавышчыне земскім спраўнікам узгадваецца атрад афіцэра польскай службы Лаўданскага і некалькі „безыменных" фарміраванняў[70]. 5 верасня 20 партызан напалі на фальварак Дзяражна, што каля Ражанкі, „узялі ўсё, што ім спадабалася" і зноў адышлі ў лясы за Нёман[71]. У Ашмянскім уездзе да канца верасня трымаўся паўстанцкі атрад капітана Пашкоўскага, які перад адыходам у Прусію раздаў усю зброю мясцовым жыхарам[72]. З надыходам халадоў звесткі аб актыўных дзеяннях партызан на тэрыторыі Гродзеншчыны знікаюць.

Пасля задушэння паўстання царызм перайшоў да дзеянняў, якія былі накіраваны з аднаго боку на пакаранне яго ўдзельнікаў, а з іншага — на паступовую ўніфікацыю сацыяльных, палітычных, культурных і рэлігійных асаблівасцей гэтых тэрыторый з цэнтральнымі губернямі імперыі. Да першай групы такіх дзеянняў можна аднесці рэпрэсіі, мэтай якіх было не толькі пакаранне непасрэдных удзельнікаў паўстання, але і запалохванне ўсіх іншых жыхароў краю.

Адной з першых праяў новай палітыкі ўлад стала паўсюднае ўзмацненне паліцэйскага рэжыму. У верасні 1831 г. віленскі губернатар прадпісаў усе ўезды Гродзенскай губерні падзяліць на колькасць паліцэйскіх акруг, якая б адпавядала лічбе парафій. На чале кожнай акругі прызначаліся палітычна надзейныя памешчыкі, кандыдатуры якіх зацвярджаліся губернатарам. Усе землеўладальнікі губерні павінны былі маёмасцю і жыццём паручыцца адзін за аднаго кругавой парукай, што яны не дапусцяць у сваіх уездах ні да ўзнікнення тайных таварыстваў,

69 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 65, арк. 52.
70 Там жа.
71 НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 3, спр. 1102, арк. 127.
72 І. Шпілеўскі, Л. Баброўіч, *Сынхроністычная табліца падзей паўстання на Беларусі, Літве і Польшчы ў 1830-1831 г.*, „Наш край", 1929, № 10, с. 45.

ні да распаўсюджання агітацыі. З тымі ж, хто дасць сховішча якому-небудзь падбухторшчыку або будзе ведаць аб яго месцазнаходжанні і не паведаміць уладам, загадвалася абыходзіцца як з удзельнікамі паўстання. За любое невыкананне прадпісаных уладамі мер па падтрыманню спакою да любога землеўладальніка маглі прымяніць спагнанне адпаведнае „цяперашнім ваенным абставінам”[73].

Вышэйшым распараджэннем ад 19 студзеня 1832 г. у гарадах Слонім, Ваўкавыск і Ліда была заснавана гродская паліцыя, якая ў сілу спецыфікі іх юрыдычнага статуса да гэтага часу там адсутнічала[74]. У 1833 г. быў уведзены інстытут ваенна-ўездных начальнікаў, у абавязкі якіх увaходзіў нагляд за парадкам і цішынёй у межах 2-3 уездаў. Гэтыя пасады займалі адстаўныя рускія вайсковыя чыны[75]. Па распараджэнню гродзенскага губернатара М. Мураўёва з мэтай недапушчэння новага паўстання, а таксама ў рамках барацьбы з г.зв. „бадзяжніцтвам”, ствараліся сельскія варты, нават у невялікіх населеных пунктах усталёўваліся рагаткі[76]. Паўсюдна за тымі асобамі, якія падазраваліся ў палітычнай ненадзейнасці альбо пасля кароткачасовай эміграцыі ці ссылкі вярталіся дамоў, ладзіўся паліцэйскі нагляд, які суправаджаўся абмежаваннямі перамяшчацца нават у межах губерні. Акрамя таго, памешчыкі Гродзенскай губерні павінны былі пісьмова пацвердзіць сваю прыхільнасць да царскай фаміліі. Толькі ў Навагрудскім уездзе было сабрана каля 250 подпісаў землеўладальнікаў на вернасць прастолу[77]. На ўзмацненне паліцэйскага рэжыму М. Мураўёў, які на той час займаў пасаду гродзенскага губернатара, атрымаў права выдаткоўваць штогод па 5000 руб. з агульных даходаў губерні[78]. Дарэчы, многія з гэтых захадаў (ваенна-ўездныя начальнікі, сялянскія каравулы, рагаткі і г.д.), што былі апрабаваны ім на пасадзе начальніка Гродзенскай губерні, пасля стануць важнымі элементамі сістэмы па кіраванню краем падчас і пасля задушэння паўстання 1863 г.

Правадніком у правядзенні рэпрэсіўнай палітыкі царскіх улад на тэрыторыі Гродзенскай губерні пасля задушэння паўстання 1831 г. становіцца губернская камісія для „вызначэння ступені віны мяцежнікаў, секвестра і канфіскацыі іх маёнткаў”.

[73] *Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов: В 4 т.*, Минск 1961-1990, т. 4: *Социально-политическая история и культура Белоруссии первой половины XIX в.*, Минск 1979, с. 93-95.

[74] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 110.

[75] О. В. Лепеш, *Комитет западных губерний: организация и деятельность (1831-1848 гг.): Автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02., Бел. гос. ун-т*, Минск 2005, с. 13.

[76] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 351, арк. 204-205.

[77] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 41, арк. 26.

[78] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 84, арк. 38.

Падобныя следчыя камісіі ў адпаведнасці з указам ад 17 ліпеня 1831 г. былі ўтвораны ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Кіеўскай, Валынскай, Падольскай губернях і Беластоцкай вобласці. Згодна з гэтымі правіламі, у склад камісіі павінны былі ўваходзіць ваенны губернатар (альбо іншая асоба ад ваеннага ведамства), цывільны губернатар, віцэ-губернатар, губернскі маршалак дваранства, старшыні першага і другога дэпартаментаў суда. У працы мог таксама браць удзел і губернскі пракурор[79]. Можна канстатаваць, што Гродзенская губернская следчая камісія (ГГСК) амаль што ніколі не адпавядала гэтым патрабаванням. Асабісты склад камісіі быў досыць нясталы. У цэлым, за час існавання ГГСК у яе працы прынялі ўдзел 17 чалавек[80].

Нягледзячы на тое, што сваё першае пасяджэнне ГГСК правяла 28 лістапада 1831 г., датай пачатку яе практычнай дзейнасці можна лічыць 15 сакавіка 1832 г., калі камісія ў адноўленым складзе сабралася другі раз. У адпаведнасці з указам ад 17 ліпеня прыярытэтным напрамкам дзейнасці гэтага органа павінен быў стаць разбор спраў былых паўстанцаў і вызначэнне ступені іх „віны". Правіламі былі вызначаны тры катэгорыі віны за ўдзел у паўстанні. Да першай прадпісвалася адносіць кіраўнікоў паўстання, да другой — тых, хто прымаў удзел у дзеяннях супраць расійскіх войск і „ўвогуле супраць законнай улады", да трэцяй — тых, хто непасрэднага ўдзелу ў паўстанні не прымаў, але меў да яго нейкае дачыненне. Асобы, якія былі аднесены да першай і другой катэгорый, перадаваліся пад юрысдыкцыю ваенна-палявых судоў. У залежнасці ад складу „злачынства" ў дачыненні да іх прымяняліся такія меры пакарання, як расстрэл, высылка на катаргу ці ў аддаленыя рэгіёны імперыі на пасяленне, аддача ў дзеючую армію (часцей за ўсё на Каўказ), сібірскія лінейныя батальёны альбо ў кантаністы, зняволенне ў крэпасці ці іншы адпаведны від пакарання.Таксама ў адносінах да гэтых асоб былі прадугледжаны і маёмасныя меры ўздзеяння, а менавіта секвестр і канфіскацыя іх рухомай і нерухомай маёмасці.

Дзеля больш аператыўнага збору інфармацыі і з мэтай аказання дапамогі ГГСК у Гродне была заснавана адмысловая камісія для допытаў паўстанцаў пад старшынствам губернскага пракурора[81]. У асобную групу былі вылучаны крымінальныя справы (напады на пошты, транспарты, вайсковыя пікеты, забойствы расійскіх афіцэраў, некаторых памешчыкаў і яўрэяў) аб дзеяннях паўстанцаў у Белавежскай пушчы, для расследавання якіх быў утвораны яшчэ адзін следчы орган. Дзейсную

[79] *ПСЗ* (выд. другое), т. VI, № 4711.

[80] А. Р. Радзюк, *Дзейнасць гродзенскай следчай камісіі 1831-1834 гг.*, „Гістарычны альманах", 2008, т. 14, с. 114.

[81] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 4, спр. 80, арк. 7.

дапамогу ГГСК таксама аказвалі ўездныя земскія суды, паліцыя і спраўнікі, да якіх камісія звярталася з прадпісаннямі зняць альбо ўдакладніць паказанні той ці іншай асобы на месцы. Што тычыцца непасрэдна ГГСК, то ў сваёй следча-пашуковай дзейнасці яна таксама шырока выкарыстоўвала допыты (не толькі з мэтай вырашэння справы асобы, ад якой гэтыя паказанні браліся, але таксама для збору матэрыялаў і на іншых інсургентаў), вочныя стаўкі, угаворы каталіцкіх, уніяцкіх і праваслаўных святароў.

Да сярэдзіны лістапада 1832 г. гэтым следчым органам у першую катэгорыю „віны" было ўнесена 9 асоб, у другую — 269 і 28 у трэцяю[82]. Падобная прадукцыйнасць працы ГГСК можна растлумачыць тым, што даволі часта на яе пасяджэннях разглядаліся справы аб дзейнасці цэлых паўстанцкіх атрадаў. У такіх выпадках усе асобы, аб якіх было вядома, што яны ўваходзілі ў яго склад, па прынцыпе калектыўнай адказнасці адносіліся да пэўнай катэгорыі (найбольш часта да другой). Сама камісія не была надзелена паўнамоцтвамі вызначаць ступень пакарання асоб, якія былі ёю аднесены да першай ці другой катэгорый. У адпаведнасці з прадпісаннем галоўнакамандуючага першай рускай арміяй вырашэнне падобных пытанняў знаходзілася ў кампетэнцыі ваенна-палявых судоў[83]. Такім чынам, камісія атрымлівала права распараджацца лёсам толькі тых паўстанцаў, якія ўдзельнічалі ў паўстанні ў найменшай ступені. У адносінах да іх, ГГСК часта практыкавала аддачу ў дзеючую рускую армію. Аднак пасля выхаду ўказа ад 4 кастрычніка 1832 г. і гэтая група былых паўстанцаў была выведзена з-пад яе юрысдыкцыі, паколькі гэтае вышэйшае распараджэнне загадвала падобным асобам „абвесціць дараванне". Тым не менш, нават пасля з'яўлення падобнага ўказа, у 1833-1834 гг. з тэрыторыі Гродзенскай губерні ў сібірскія і архангельскія лінейныя батальёны, у расійскую армію на Каўказ былі высланы дзесяткі (калі не сотні) асоб. У адпаведнасці з „Алфавітным спісам ўдзельнікаў паўстання" падобных ссыльных было 77 чалавек[84]. У абсалютнай большасці выпадкаў гэта былі выхадцы з ніжэйшых саслоўяў, якія адпраўляліся на ўсход па рашэнню ГГСК без іх унясення ў тую ці іншую катэгорыю.

Ва ўказе ад 17 ліпеня 1831 г. былі выкладзены і правілы пераводу маёнткаў з ліку прыватнаўласніцкіх у казённае ведамства. Яны вельмі дэталёва акрэслівалі ўвесь механізм гэтага працэсу. Ён, як і ўся тагачасная бюракратычная машына Расійскай імперыі, быў досыць складаным. Першым этапам на шляху да канфіскацыі маёнтка было вызна-

[82] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 177, арк. 4-5.
[83] НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 1, спр. 64, арк. 15.
[84] В. В. Гарбачова, *Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі*, с. 157.

чэнне ступені „віны" яго ўладальніка. Пры ўмове, калі тая ці іншая асоба была аднесена да першай ці другой катэгорыі, аўтаматычна распачынаўся пошук яе маёмасці. У гэтай справе дзейсную дапамогу камісіям павінны былі аказваць губернскія ваенныя і цывільныя ўлады. Самі камісіі непасрэдна не займаліся выкананнем пастаноў аб секвестры. Адпаведныя пастановы накіроўваліся ў ведамства губернскага кіравання і казённых палат. Тыя, у сваю чаргу, вызначалі чыноўнікаў (якія таксама маглі паходзіць з іншага ведамства) для прыёму і вопісу маёнтка, адносна якога камісіяй было прынята адпаведнае рашэнне. І толькі пасля апісання, вылічэння даходаў, вызначэння спосабу загаспадарання, маёнтак лічыўся асеквестраваным. Пасля аднясення камісіяй асобы да той ці іншай катэгорыі, звесткі аб прынятым прысудзе з кароткай нататкай аб маёмасці адсылаліся ў вышэйшыя інстанцыі для канчатковай канфірмацыі, а таксама ў іншыя заходнія губерні імперыі для пошуку маёмасці і там.

Па стане на 1837 г., калі колькасць перайшоўшых да казны нерухомых маёнткаў больш ці менш стабілізавалася, у выніку канфіскацый па Гродзенскай губерні 56 асоб пазбавіліся 76 зямельных уладанняў і чатырох дамоў. Паколькі ўладамі ў лік гэтых прыватнаўласніцкіх зямельных валоданняў былі ўключаны 4 маёнткі, якія былі адабраны ў Бярозаўскага кляштара картэзіянцаў і Дзярэчынскага кляштара дамініканцаў, то агульная лічба канфіскаваных маёнткаў па губерні ўзрастае да васьмідзесяці[85].

Паўстанне 1830-1831 гг. і пашырэнне рэвалюцыйнага руху ў Еўропе падштурхнулі Мікалая І да пераходу ў бок ахоўнага кансерватызму. Ідэалагічным абгрунтаваннем гэтай палітыкі пасля 1831 г. стала дактрына афіцыйнай народнасці, што была сфармулявана Сяргеем Уваравым. У яе аснове былі пакладзены тры прынцыпы: „Праваслаўе, самаўладдзе, народнасць", якія, на думку міністра асветы павінны былі засцерагчы Расію ад рэвалюцыйных нягод і забяспечыць яе месіянскую будучыню. Галоўным у гэтым трыадзінстве з'ўлялася ідэя народнасці, якая цесна перапляталася з паняццем дзяржавы. Паколькі ва ўзаемадзеянні гэтых двух элементаў народнасць займала падпарадкаванае месца, Увараў лічыў, што дзяржава павінна насаджаць „сапраўдныя" нацыянальныя каштоўнасці сярод пасіўнага насельніцтва. Зыходзячы з гэтай прадпасылкі, ён рабіў высновы аб тым, што дзяржава можа сілком прышчапіць рускую культуру нацыянальным ускраінам і „тым са-

[85] А. Р. Радзюк, *Дзейнасць гродзенскай следчай камісіі 1831-1834 гг.*, „Гістарычны альманах", 2008, т. 14, с. 126-129.

[86] Ц. Х. Виттекер, *Граф С. С. Уваров и его время*, Санкт-Петербург 1999, с. 125-126.

мым нерускіх ператварыць у рускіх"[86]. У аснове гэтых пераўтварэнняў у свядомасці, на думку міністра адукацыі, павінна была быць пакладзена сістэма адукацыі, але на практыцы гэты працэс адбываўся і па іншых каналах.

Актыўны ўдзел у фармаванні новай палітыкі ў дачыненні да зямель былога ВКЛ прымаў створаны пасля задушэння паўстання па вусным распараджэнні Мікалая І Камітэт па справах заходніх губерняў. Ужо на першым пасяджэнні была акрэслена галоўная мэта яго дзейнасці: „каб губерні ад Польшчы далучаныя, прыведзены былі да таго парадку, які (...) у іншых расійскіх губернях існуе". Галоўнымі накірункамі дзейнасці гэтага органа былі пераўтварэнні ў галіне саслоўнай палітыкі, увядзенне агульнарасійскай сістэмы заканадаўства, рэарганізацыя сістэмы адукацыі і аказанне падтрымкі афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіі. Таксама шмат увагі надавалася Камітэтам справе прыцягнення рускага элемента на гэтыя землі, як шляхам надання рускім чыноўнікам пэўных прывілееў, так і шляхам перадачы ў доўгатэрміновае валоданне канфіскаваных маёнткаў і перасялення на дзяржаўныя землі рускіх сялян. Не ўсе з гэтых праектаў былі рэалізаваны да канца, аднак тыя з іх, што набылі моц указаў, аказалі значны ўплыў на сацыяльна-культурнае, палітычнае і рэлігійнае жыццё Гродзеншчыны.

Менавіта Камітэтам па справах заходніх губерняў быў падрыхтаваны царскі ўказ ад 19 кастрычніка 1831 г. „аб разборы шляхты ў заходніх губернях і аб уладкаванні такога кшталту людзей". Асноўнай мэтай гэтага закону з'яўлялася выключэнне з прывеліяванага саслоўя ўсіх тых асоб, якія называлі сабе шляхтай без адпаведнага на гэта пацвярджэння. Тыя, хто не здолеў даказаць свайго паходжання ў Герольдыі, былі падзелены законам на так званых сельскіх і гарадскіх абывацелей. Першыя з іх атрымалі назву аднадворцаў, другія — грамадзян[87]. Іншым крытэрыем, які дазваляў захаваць шляхецкую годнасць, была наяўнасць зямельнай уласнасці і прыгонных. Так, у адпаведнасці з указам ад 11 лістапада 1832 г. усю шляхту неабходна было падзяліць на тры катэгорыі. Да першай з іх, між іншым, прадпісвалася адносіць асоб, шляхецтва якіх нікім пацверджана не было, але яны валодалі населенымі маёнткамі. У трэцюю ж катэгорыю былі ўключаны асобы, якія зямельнай уласнасці не мелі, дваранскімі сходамі ў годнасці зацверджаны не былі[88]. Прадстаўнікі гэтай катэгорыі павінны былі з гэтага часу плаціць падаткі і выконваць рэкруцкую павіннасць. Такім чынам галоўны ўдар скіроўваўся супраць беззямельнай шляхты. Гэта было выклікана тым, што менавіта гэты сацыяльны элемент падчас паўстан-

[87] *ПСЗ* (выд. другое), т. VI, № 4869.
[88] *ПСЗ* (выд. другое), т. VIII, № 5746.

ня 1831 г. вылучаўся найбольшай актыўнасцю і надалей заставаўся самым небяспечным саслоўем грамадства на землях Беларусі. У наступныя гады палітыка царызму была накіравана на далейшую рэгламентацыю трох адзначаных катэгорый з мэтай недапушчэння магчымасці ўваходу ў склад дваранства асоб, якія не мелі пісьмовых доказаў сваёй годнасці і канчатковае звядзенне прадстаўнікоў трэцяй катэгорыі да групы падатковых саслоўяў. Такім чынам, у 1832 г. толькі частка найбяднейшай шляхты, прычым не зацверджанай дэпутацкімі сходамі, павінна была перайсці ў разрады аднадворцаў заходніх губерняў і грамадзян.

На тэрыторыі Гродзеншчыны разбор шляхты меў даволі глыбокія сацыяльныя наступствы. Ацэньваючы шансы мясцовай шляхты прайсці праз рэшата адбору, гродзенскі губернатар М. Мураўёў пісаў, „што наўрад ці палова (...) гэтага саслоўя, з якога толькі некаторыя валодаюць рознымі маёнткамі, на самой справе належыць да дваранскіх родаў і могуць гэта дакладна даказаць”[89]. Гэтае сцвярджэнне мела пад сабой рэальную аснову. Ужо праз год пасля пачатку дзеяння ўказа ад 11 кастрычніка 1831 г. (па папярэдніх даных на 1 студзеня 1833 г.) з 21 350 асоб мужчынскага полу, якія раней адносіліся да ліку шляхты і дваранства, $^{1}/_{3}$ частка (7 057) была ўжо ўпісана ў лік аднадворцаў. Па даных польскай даследчыцы Іаланты Сікорскай-Кулешы, на 1834 г. 50% дробнай шляхты Гродзенскай губерні было выключана з гэтага саслоўя і перайшло ў лік аднадворцаў[90]. У далейшым працэс верыфікацыі дадзенай страты працягваўся.

Значнай рэарганізацыі пасля паўстання была падвергнута і сістэма шляхецкага самакіравання. Першым крокам стаў царскі ўказ ад 31 сакавіка 1831 г., які пазбаўляў мясцовую шляхту права выбіраць засядальнікаў у паліцэйскія земскія суды. Іншымі мерапрыемствамі ўлад у гэтым кірунку сталі наданне ўсім прысутным месцам і службовым асобам у заходніх губернях тых найменняў, якія існавалі ў цэнтральных губернях імперыі (што прывяло да скасавання гродскіх судоў, суддзяў і падсудкаў, якіх выбірала мясцовая шляхта), ліквідацыя выбраных шляхтай пасад падкаморых, каморнікаў, возных і харунжых. Такім чынам структурная арганізацыя органаў дваранскага самакіравання на беларускіх землях была фактычна ўніфікавана з цэнтральнымі расійскімі губернямі[91]. На шляху асоб, якія прымалі ўдзел у паўстанні, ставіліся бар’еры на шляху іх службы. На службу (як дзяржаўную, так і па выбарах) не магла паступіць асоба, за якой быў усталяваны афі-

[89] РДГА, ф. 1266, воп. 1, спр. 11, арк. 101.

[90] J. Sikorska-Kulesza, *Deklasacja drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX w.*, Warszawa 1998, s. 42.

[91] С. Токць, *Шляхецкае самакіраванне ў Гродзенскай губерні (пачатак XIX ст.— 60-ыя гады XIX ст.)*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 1997, № 7, с. 5-22

цыйны паліцэйскі нагляд. У адпаведнасці з указам ад 29 кастрычніка 1847 г. мясцовым выхадцам, калі нават яны атрымалі Вышэйшае дараванне, забаранялася займаць дваранскія выбарныя пасады і працаваць у якасці ўрадавых чыноўнікаў[92]. Адпаведныя спісы за 1833 і 1848 гады, сведчаць аб тым, што адзначаная мера ў Гродзенскай губерні прымянялася і раней — да і пасля 1847 г.[93] Справаводства ўсіх прысутных месцаў у абавязковым парадку пераводзілася на рускую мову. У сувязі з гэтым у штат некаторых устаноў уводзілася пасада перакладчыка.

Рэформа сістэмы сярэдняй адукацыі ў Расійскай імперыі пачалася ў 1828 г. Паўстанне 1830-1831 гг. дало царызму зручную падставу для ліквідацыі склаўшайся тут сістэмы навучання. Першым крокам у гэтым кірунку стала ліквідацыя Віленскай навучальнай акругі і самога Віленскага ўніверсітэта „як галоўнага гнязда вольнадумства". У 1833 г. разам са скасаваннем Гродзенскага дамініканскага кляштара былі зліквідаваны гімназія і трохкласная школа, што існавалі пры ім: „гродзенскі кляштар дамініканскага ордэна і навучальная пры ім установа не могуць і не павінны існаваць (...) па моцным ўдзеле некаторых ксяндзоў, настаўнікаў і нават вучняў у зламысных намерах (справа эмісараў — А. Р.)"[94]. На іх месцы ў 1835 г. была адчынена губернская гімназія, якая першыя некалькі гадоў месцілася ў палацы Любецкага на Магістрацкай плошчы. Павятовае шляхецкае вучылішча ў Брэсце, што знаходзілася пад апекай базыльян, было зачынена ўжо ў 1831 г., а яго будынак часова прызначаны пад вайсковы шпіталь. Аднак ужо ў тым жа годзе школа была адчынена ў якасці пяцікласнай рускай шляхецкай школы[95]. 6 лістапада 1832 г. Мікалай Навасільцаў зачыніў школу ў Барунах (Ашмянскі ўезд), а 28 жніўня канчаткова зліквідаваў павятовае вучылішча ў Лідзе[96]. У 1835 г. былі скасаваны павятовыя школы ў Слоніме і Лыскаве (Ваўкавыскі ўезд), у Навагрудку дамініканскае вучылішча, навучэнцы якога, пачынаючы ад другога класа, прынялі актыўны ўдзел у паўстанні, зліквідавана ў 1833 г., а замест яго адкрыта руская шляхецкая школа (сам кляштар быў зачынены значна пазней). І, нарэшце, Шчучынскае вучылішча пры піярскім кляштары было скасавана разам з кляштарам[97]. Усе новыя школы, што былі адкрыты на мес-

[92] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 12, спр. 930, арк. 1.

[93] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 877; НГАБ у Гродне, ф. 4, воп. 2, спр. 77.

[94] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 295, арк. 66.

[95] L. Zasztowt, *Kresy 1832-64. Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawnej Rzeczypospolitej*, Warszawa 1997, s. 254.

[96] D. Beauvois, *Powstanie listopadowe a szkolnictwo na ziemiach litewsko-ruskich*, [w:] *Powstanie listopadowe 1830-1831. Geneza. Uwarunkowania. Bilans. Porównania*, Wrocław 1983, s. 53.

[97] НГАБ у Гродне, ф. 31, воп. 2, арк. 91, 3.

цы ранейшых, у 1833 г. атрымалі новую праграму навучання разам з новым бюджэтам. Змены закранулі літаральна ўсе прыступкі тагачаснай адукацыйнай сістэмы: гімназіі (таксама ў губернскую ў Свіслачы), вучылішчы пры гэтых гімназіях, адмысловыя ўездныя вучылішчы, пачатковыя і прыходскія вучылішчы і, нават, некаторыя прыватныя навучальныя пансіёны. Вось так скончылася справа секулярызацыі навучальных установ на Гродзеншчыне, распачатая яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай Адукацыйнай камісіяй.

Адначасова з працэсам адкрыцця новых школ адбываўся перавод выкладання ўсіх прадметаў на рускую мову. Актыўна ішоў працэс прыцягнення ў школьную справу на беларускіх землях настаўнікаў-выхадцаў з Расіі. Дзякуючы намаганням папячыцеля Беларускай навучальнай акругі, усе выкладчыкі рускай мовы аўтаматычна атрымалі званне старэйшых настаўнікаў і ўсе прывілеі, звязаныя з гэтым статусам. Урад не хаваў дзеля чаго ён ідзе на такія крокі. Усё гэта рабілася з мэтай, каб „русский язык посредством первоначального воспитания сделать там народным”[98]. Сярод іншых мерапрыемстваў па русіфікацыі сістэмы народнай адукацыі можна адзначыць забароны выкладання на польскай мове ў навучальных установах (1836 г.), а таксама заахвочванне вучняў Беларускай акругі атрымліваць вышэйшую адукацыю ў расійскіх універсітэтах шляхам прызначэння ім цалкавіта пансіёна на час вучобы.

Падтрымка паўстання з боку каталіцкага духавенства стала адной з прычын ліквідацыі некаторых кляштараў на тэрыторыі Гродзеншчыны. Хаця, як гэта можа падацца са зместу дакументаў таго часу, гэтыя мерапрыемствы царызм праводзіў без якой-небудзь сувязі з падзеямі 1831 г., а выключна дзеля карысці саміх ордэнаў. Перш-наперш Міністэрствам унутраных спраў па загадзе імператара быў праведзены аналіз прычын „заняпаду” кляштараў у заходніх губернях. Такой прычынай, на думку чыноўнікаў, аказалася занадта вялікая колькасць кляштараў і вельмі малая лічба манахаў у іх. Таму ўказам ад 17 ліпеня 1832 г. Мікалай I „дзеля вяртання ў іх духу сапраўднага хрысціянства меў ласку прызнаць неабходным тэрмінова пакласці канец падобнаму парушэнню статутаў скасаваннем залішніх кляштараў”[99]. Пад дзеянне гэтага ўказа ў Гродзенскай губерні трапіла 15 кляштараў[100]. Акрамя таго, яшчэ раней былі зачынены картэзіянскі кляштар у Бярозе за тое, што амаль што ўсе яго манахі прынялі чынны ўдзел у паўстанні, а таксама дамініканскі манастыр у Дзярэчыне за тое, што ў яго скляпеннях спрабавалі выратаваць ад канфіскацыі мастацкія творы з дзярэчынскага палаца Сапегаў. А ў 1833 г. за падтрымку манахамі ўдзельнікаў эксперы-

[98] *ПСЗ* (выд. другое), т. VIII, № 6569.

[99] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 233, арк. 1.

[100] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 233, арк. 45-46; ф. 31, воп. 2, спр. 129, арк. 1.

цыі Юзафа Заліўскага быў ліквідаваны даміліканскі кляштар у Гродне. Такім чынам, агульная лічба скасаваных на пачатку 30-х гадоў кляштараў па Гродзенскай губерні павялічваецца да 18.

**Каталіцкія кляштары, якія былі зачынены ўладамі на тэрыторыі Гродзенскай губерні на пач. 30-х гг. XIX ст.**

| № | Мясцовасць | Уезд | Ордэн |
|---|---|---|---|
| 1 | Бухавічы | Кобрынскі | дамініканскі |
| 2 | Бяроза-Картузская | Пружанскі | картэзіянскі |
| 3 | Валоўка | Навагрудскі | дамініканскі |
| 4 | Васілішкі | Лідскі | дамініканскі |
| 5 | Вістычы | Брэсцкі | цыстэрсаў |
| 6 | Гродна | Гродзенскі | дамініканскі |
| 7 | Дзярэчын | Слонімскі | дамініканскі |
| 8 | Ельня | Лідскі | дамініканскі |
| 9 | Жалудок | Лідскі | кармеліцкі |
| 10 | Калеснікі | Лідскі | кармеліцкі |
| 11 | Канюхі | Ваўкавыскі | дамініканскі |
| 12 | Крамянец | Ваўкавыскі | канонікаў латэранскіх |
| 13 | Лапенікі | Ваўкавыскі | францысканскі |
| 14 | Ліда | Лідскі | кармеліцкі |
| 15 | Палонка | Слонімскі | дамініканскі |
| 16 | Свіслач | Гродзенскі | францысканскі |
| 17 | Шчучын | Лідскі | піяраў |
| 18 | Шэйбакполе | Лідскі | францысканскі |

Касцёлы пры гэтых кляштарах былі пераведзены ў разрад прыходскіх. Манахаў было загадана ў суправаджэнні паліцыі пераводзіць у іншыя, аддаленыя ад мяжы мясціны. Разам з тым адбываўся працэс пераразмеркавання пакляшторнай уласнасці. Уся рухомая маёмасць, якая ўладамі прызнавалася непатрэбнай, ішла на продаж з аўкцыёна. Так, напрыклад, з малатка пайшла маёмасць аптэкі шчучынскага піярскага кляштара (выручка склала каля 3 тыс. руб.). Продажу таксама падлягалі гаспадарчы інвентар, сталовае срэбра, абразы, мэбля, харчовыя запасы і г.д. Частка будынкаў былых каталіцкіх манастыроў, а таксама сады і агароды пры іх здаваліся ў арэнду. Напрыканцы 1830-х гадоў некаторыя з іх былі перададзены ў распараджэнне ваеннага міністэрства. Таму ў мурах былых лідскага, шчучынскага, жалудоцкага, бярозаўскага, дзярэчынскага, крамянецкага кляштараў былі размешчаны склады, брыгадныя і батальёныя штабы і г.д.[101] Трагічна склаўся лёс

[101] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 5, спр. 290, арк. 5, 10, 13.

бібліятэк гэтых манаскіх устаноў. Значная частка багатых кнігазбораў была разрабавана. Вядома прозвішча віленскага каноніка Малышэвіча, які спецыялізаваўся ў зборы пакляшторных друкаў і рукапісаў у Гродзенскай губерні з наступнай перадачай іх (не без карысці для сябе) у Імператарскую публічную бібліятэку[102].

Паўстанне 1830-1831 гг. паскорыла працэс ліквідацыі Уніяцкай царквы. Як у выпадку з каталіцкімі кляштарамі ў першай палове XIX ст. на Гродзеншчыне былі ліквідаваны 10 манастыроў адзінага ўніяцкага ордэна базыльян. Сярод іншага, гэта былі мужчынскія абшчыны ў Навасельцах, Ражанцы, Дараве, Лаўрышаве (адзін з найбольш старажытных манастыроў Беларусі), Воўпе, жаночы ў Навагрудку і інш.[103] Шмат увагі мясцовымі ўладамі ў гэты час надавалася прывядзенню грэка-каталіцкіх цэркваў у адпаведнасць з правіламі грэка-ўсходняй царквы. У сярэдзіне 30-х гадоў у некалькіх сотнях уніяцкіх храмаў на Гродзеншчыне былі заменены іканастасы і прастолы па праваслаўным ўзоры. Адначасова з гэтым у цэрквах знішчаліся арганы, лавы, бакавыя прастолы, усё іншае, што не адпавядала правілам. Гэтыя ператварэнні былі толькі першымі крокамі на шляху цалкавітага скасавання ўніі ў 1839 г.

Іншым важным наступствам паўстання 1830-1831 гг. стала масавая эміграцыя на Захад асоб, якія прымалі ў ім актыўны ўдзел. Баючыся пакарання з боку царызму, былыя паўстанцы рознымі шляхамі накіроўваліся за мяжу — у Аўстрыю, Прусію, Велікабрытанію і Швейцарыю, але найбольш у Францыю. Менавіта ў гэтай краіне ўзніклі найбольш моцныя эміграцыйныя асяродкі, якія аб'ядноўвалі выхадцаў з зямель былога ВКЛ. Адной з першай арганізацый, якая была створана ўдзельнікамі падзей 1830-1831 гг. у Парыжы стала Таварыства літоўскіх і рускіх зямель. Яно ўзнікла па ініцыятыве Цэзарыя Плятэра 10 снежня 1831 г.: „Літвіны (...) змушаныя да выгнання, сабраліся ў Парыжы і ўбачылі, што Еўропа не мае адпавядаючых рэчаіснасці ўяўленняў пра паўстанне ў Літве, а таксама і пра саміх літвінаў, таму (...) стварылі Таварыства".

Адным з галоўных накірункаў дзейнасці Таварыства стала захаванне гістарычнай памяці аб падзеях, якія папярэднічалі паўстанню і непасрэдна тычыліся гэтай падзеі на землях Беларусі і Літвы. З гэтай мэтай выхадцамі з зямель былога ВКЛ быў арганізаваны збор і выданне матэрыялаў па дадзенай тэматыцы. Сярод прац, якія тычыліся непасрэдна тэрыторыі Гродзеншчыны, адзначым успаміны і даследаванні І. Крываблоцкага, І. Клюкоўскага, Т. Краскоўскага, М. Валовіча і інш. Актыўнымі супрацоўнікамі Таварыства таксама былі выхадцы з Гара-

[102] P. Gach, *Popowstaniowa kasata klasztorów w guberniach zachodnich cesarstwa rosyjskiego w 1832 r.*, „Roczniki Humanistyczne", t. XXVIII, z. 2, s. 207.

[103] НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, спр. 39.

дзеншчыны Адам Міцкевіч і Ігнат Дамейка. Менавіта па прапанове апошняга была праведзена рэарганізацыя Таварыства літоўскага і рускіх зямель на 2 секцыі — гісторыка-літаратурную і навуковую. Дзейнасць першай узначаліў непасрэдна А. Міцкевіч.

Аб'яднанне эмігрантаў былога ВКЛ у адну арганізацыю садзейнічала захаванню гістарычнай памяці выхадцаў з гэтых зямель, іх самасвядомасці. Сябры Таварыства рознымі спосабамі імкнуліся падкрэсліць адметнасць сваёй суполкі і саміх сябе ад г.зв. „караняжэй" (koroniarzy) — выхадцаў з тэрыторыі Польшчы. Сярод іншага гэта выявілася ў святкаванні гадавіны паўстання не 29 лістапада, а 25 сакавіка (дзень узброенага выступлення ў Расенях) і г.д. М. Валовіч падчас следства ў Гродне адкрыта заявіў, што Таварыства літоўскае было асобна ад польскага, „якое намі, літоўцамі, пагарджала". Эміграцыя ў цэлым адыграла значную ролю ў справе дэмакратызацыі нацыянальна-вызваленчага руху на землях Беларусі. Менавіта ў эміграцкіх колах была падрыхтавана экспедыцыя Заліўскага, актыўным удзельнікам якой з'яўляўся М. Валовіч і Шымон Канарскі, які напрыканцы 30-х гадоў XIX ст. стварыў разгалінаваную сетку Дэмакратычнага таварыства на землях Беларусі, Украіны і Літвы.

**Streszczenie**

Grodzieńszczyzna była tym regionem Białorusi, gdzie powstanie listopadowe miało największy rozmach. Istniał tu szereg wewnętrznych warunków sprzyjających wybuchowi walk zbrojnych, przy czym znaczący wpływ miały wydarzenia w sąsiednim Królestwie Polskim. Ruch powstańczy na Grodzieńszczyźnie rozwijał się głównie w oparciu o własne zasoby wewnętrzne. Charakterystyczną cechą guberni grodzieńskiej było to, że w odróżnieniu od innych regionów Białorusi i Litwy podstawowe siły powstańców w pierwszym etapie powstania skoncentrowane były w jednym miejscu — w Puszczy Białowieskiej. W celu zdławienia powstania władze carskie wykorzystywały nie tylko siłę wojska. Represje, zastraszanie, zabieranie na własność państwa majątków itp. miały na celu zmniejszenie bazy społecznej niezbędnej do prowadzenia walk narodowowyzwoleńczych. Po upadku powstania władze carskie przeprowadziły szereg działań represyjnych, które dotknęły wszystkich sfer życia, m.in. społecznej, religijnej, politycznej, kulturalnej. Podstawowym celem tej polityki była unifikacja ziem byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego z centralnymi regionami imperium rosyjskiego.

**Summary**

Grodzieńszczyzna (Grodno area) was this part of Belarus where the November Uprising gained the greatest momentum. Several internal conditions favoring the outbreak of armed struggle existed there. Nevertheless, the events in the neighboring Kingdom of Poland were of significant impact too. The insurgent movement in Grodno area developed mainly on the basis of its own internal resources. As opposed to other regions of Belarus and Lithuania, Grodno Guberniya (Province) was characterized by the fact that in the first phase of the Uprising chief insurgent forces were gathered in one place — i.e. in Białowieża Forest. In order to crush the Uprising Tsar authorities not only used the army power. Repressions, intimidation, seizures of estates to be owned by the state, etc. aimed at decreasing the social

base necessary to conduct the struggle for freedom and independence. After the fall of the Uprising Tsar authorities carried out several repressive actions which affected all spheres of life, social, religious, political and cultural, among the others. A fundamental purpose of this policy was unification of former Grand Duchy of Lithuania's lands with central regions of the Russian Empire.

**Alaksandr Radziuk** — kandydat nauk historycznych, pracownik naukowy Państwowego Uniwersytetu Rolniczego w Grodnie. Zainteresowania badawcze: ruch narodowowyzwoleńczy na Białorusi i polityka represyjna caryzmu w XIX w.